

ЯКАЯ КРАМА ПАТРЭБНА ВЁСЦЫ? 7

НОВЫ СЕЗОН У ВЯЛІКІМ ТЭАТРЫ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ВЕРАСНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 176 (30310)


## КОРАТКА

• «Беларуснафта» мае намер здабыць не менш як два мільёны тон чорнага золата ў 2025 годзе.

• **На прампляцоўку АТ «Алкон» у Мурманскай вобласці паступіла чарговая партыя кар'ерных самазвалаў серыі БЕЛАЗ-7513 — сем машын грузападымальнасцю 130 т.**

• Аб'ём рэалізацыі трактароў BELARUS у Казахстане за паўгода ў 2024-м вырас на 40 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

• **Каля 35 тыс. хрызантэм, 10 тыс. дрэў і 100 тыс. кустоў высадзяць у Мінску восенню.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:**

*«Калі прааналізаваць усе канфлікты, якія ўспыхваюць у свеце, то, як правіла, гэтыя канфлікты пачынаюць разгарацца знутры, таму рызыкі і выклікі, якія маюць месца быць унутры краіны, адкідваць ні ў якім разе нельга. Вопыт 2020 года нас шмат чаму навучыў. І тое, што спрабаваў зрабіць калектыўны Захад, выкарыстоўваючы метадычкі Шарпа, — развязаць чарговую каляровую рэвалюцыю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а потым увесці пад выглядам гэтай каляровай рэвалюцыі «вызваленчыя» нейкія сілы для абароны народа Беларусі. І Захад ад гэтага не адмовіўся. Мы ведаем, хто іх можа развязаць, яны, скажам так, на алоўку ў спецслужбаў. І не дай бог яны падымуць галовы — мы іх прыдушым адразу ж. Мы зробім усё магчымае, каб наш народ жыў у міры і бяспецы».*


ISSN 1990 — 763X


З першых вуснаў

# «НАРОДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ, НА ЧАЛЕ ЯКОЙ ПАВІННЫ ІСЦІ ДЭПУТАТЫ, ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ. І ЯНА ДАЕ СВОЙ ЭФЕКТ»

### Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Ігара Сергяенку

**Шэраг пытанняў, якія Прэзідэнт задаў Старшыні Палаты прадстаўнікоў, датычыліся работы дэпутацкага корпуса восьмага склікання. У першую чаргу, кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як функцыянуюць органы і сістэмы Палаты прадстаўнікоў, як ажыццяўляецца заканадаўчая і міжнародная дзейнасць. У полі зроку Аляксандра Лукашэнкі — і пытанні арганізацыі працы, жыллёвага забеспячэння дэпутатаў.**





Фота БелТА.

Прэзідэнт пацікавіўся ў Ігара Сергяенкі, як ён уладкаваўся на новым працоўным месцы. Апошнім часам Старшыня Палаты прадстаўнікоў змяніў некалькі адказных пасад: на працягу многіх гадоў працаваў у сістэме Камітэта дзяржбяспекі, пасля ўзначальваў Адміністрацыю Прэзідэнта. «Усё-такі такая перамена работы, — патлумачыў сваю ўвагу да гэтага пытання кіраўнік дзяржавы. — З абсалютна закрытай, ціхай работы перайсці на работу самую цяжкую — у Адміністрацыю Прэзідэнта, а потым — яшчэ і Палата прадстаўнікоў. Гэта такія крутыя павароты ў жыцці, што любому чалавеку мала не пакажацца. Таму як працуецца?»

Прагучала ад Прэзідэнта пытанне — як у цэлым працуе Палата прадстаўнікоў? «Ці ўсе функцыянуюць органы і сістэмы нашай Палаты прадстаўнікоў, нашага парламента, — удакладніў ён. — Натуральна, галоўны прадукт — заканадаўчая дзейнасць. Як тут ідуць справы? Ці патрэбна нейкая дапамога і падтрымка? Вельмі шмат выбрана дэпутатаў першы раз, і, натуральна, парламенцкага вопыту работы няма. Ці ёсць тут пэўныя праблемы?»

Пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка і тым, як арганізавана работа дэпутацкага корпуса, ці ўсе забяспечаны жыллём. «У нас жа дом пабудаваны, дзе дэпутаты падчас работы жывуць, — паведаміў ён. — Ці ўсім хапіла месца для пражывання? Можа быць, з гаспадарчага пункту гледжання пэўныя ёсць праблемы?»

Прэзідэнт пацікавіўся, як Ігар Сергяенка ўвогуле свежым вокам бачыць у будучыні работу дэпутатаў — як у цэнтры, так і на месцах. «Вельмі важна цяпер закруціць-раскруціць работу на міжнародным узроўні, — паставіў задачу беларускі лідар. — Усё-такі народная дыпламатыя, на чале якой павінны ісці дэпутаты, цяпер вельмі важная. І яна дае свой эфект. Вы бачыце гэта і па рабоце нашых сенатараў. Іх, вядома, значна менш. Я думаю, што ў гэтым кірунку трэба дзейнічаць і Палаце прадстаўнікоў. Тут, як вы лічыце, як нам трэба пабудаваць работу?»

Па словах Ігара Сергяенкі, Палата прадстаўнікоў у абноўленым складзе працуе ўжо фактычна пяць месяцаў. «Усе арганізацыйныя пытанні, як вы і ставілі задачы, вырашаны, — паведаміў ён. — Я маю на ўвазе тыя пытанні, якія звязаны з забеспячэннем работы кожнага дэпутата — пачынаючы з яго працоўнага месца, заканчваючы пытаннямі, звязанымі з пражываннем. Усе дэпутаты ў годных умовах сёння жывуць і працуюць».

СТАР. 2

Напярэдадні

## ЧЫМ ПАРАДУЕ «НАШ ДОМ»?

### Міжнародная спецыялізіваная выстаўка жыллёва-камунальнай гаспадаркі пройдзе ў Мінску

**Упершыню выстаўка «Наш дом» адбылася ў беларускай сталіцы ў 2022 годзе, і пілотны праект аказаўся паспяховым, адзначыла начальнік упраўлення выставак і кірмашоў РУП «Нацыянальны выставачны цэнтр БелЭкспа» Вольга КРАСОЎСКАЯ. Удзел у ёй тады ўзялі 111 экспанентаў, выстаўку наведала больш за 5 тысяч чалавек.**

СТАР. 3




Клімат

## ТРАПІЧНЫЯ НОЧЫ, УРАГАНЫ З ЛІЎНЯМІ І ТЭМПЕРАТУРА ПАД 40

### Чым запомнілася мінулае лета?



**Сярэдняя па краіне тэмпература паветра за летні сезон 2024 года склала плюс 19,9 градуса, што на 1,9 градуса вышэй за кліматычную норму. Гэты летні сезон, пасля лета 2021-га, заняў другое месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага цёплага да самага халоднага сезона, пачынаючы з 1881 года.**

**Пра гэта заявіла інжынер-метэаролаг аддзела вывучэння змяненняў клімату службы метэаралагічнага і кліматычнага маніторынгу, фонду даных Белгідрамета Таццяна ГІЛЬ.**

СТАР. 8

# «НАРОДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ, НА ЧАЛЕ ЯКОЙ ПАВІННЫ ІСЦІ ДЭПУТАТЫ, ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ. І ЯНА ДАЕ СВОЙ ЭФЕКТ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што ў восьмым скліканні працуе 20 дэпутатаў з папярэдняга, сёмага, склікання. «90 чалавек фактычна новыя — з розным вопытам работы, з розным узроўнем і юрыдычнай падрыхтоўкі, і ў цэлым з рознымі падыходамі, але ўсе яны — людзі-патрыёты, якія працуюць на краіну, — падкрэсліў спікер. — Сёння ў складзе дэпутацкага корпуса працуюць 73 мужчыны і 37 жанчын. 75 чалавек маюць вопыт кіруючай работы — працавалі кіраўнікамі, намеснікамі рознага ўзроўню, у тым ліку кіравалі працоўнымі калектывамі. Дзесяць дэпутатаў маюць вучоныя ступені і вучоныя званні. 70 дэпутатаў прадстаўляюць палітычныя партыі.

Такі аналітычны зрэз паказвае, што выбраны аўтарытэтныя людзі, якія прадстаўляюць свае рэгіёны».

**Вераніка КАНЮТА.**

## У тэму

Як адзначыў у размове з журналістамі **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** у адпаведнасці з Канстытуцыяй, у трэці аўторак верасня (сёлета гэта сімвалічна прыпадае на 17 верасня, калі беларусы святкуюць Дзень народнага адзінства) пачне работу другая сесія Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання. «Я далажыў кіраўніку дзяржавы аб тым, якія законапраекты будуць выносіцца на разгляд першага дня і ў цэлым сесіі, — паведаміў спікер. — Законапраекты датычацца крымінальна-прававой сферы, сферы адукацыі, пытанняў сацыяльнай абароны, эканомікі, абароны. Паэтапна мы гэтыя змяненні будзем прымаць, з улікам меркаванняў экспертаў, насельніцтва, выбаршчыкаў, навуковых і дзелавых колаў».

Ішла размова ў кабінеце Прэзідэнта і на тэму работы дэпутатаў у выбарчых акругах. «Згодна з практыкай, якая ўсталявалася, тыдзень на месяц дэпутаты працуюць у выбарчай акрузе, — заўважыў Ігар Сергіенка. — Гэта і прыёмы грамадзян, удзел у агітацыйна-прапагандысцкіх мерапрыемствах, у пасяджэннях раённых і абласных выканаўчых камітэтаў. Працуючы ў акругах, дэпутаты вывучаюць грамадскую думку па тых ці іншых пытаннях, рыхтуюць свой зрэз грамадскай думкі. Гэтаму кіраўнік дзяржавы ўдзяліў асаблівую ўвагу, падкрэсліўшы, што голас дэпутата — гэта інфармацыя, якая атрымліваецца непасрэдна з месцаў, самая цікавая і жывая, яна дазваляе рабіць пэўныя высновы. Атрыманую інфармацыю трэба аналізаваць і ўлічваць у далейшай рабоце, грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. Людзі прыходзяць з рознымі пытаннямі, з рознымі тэмамі, гэтыя пытанні нашы дэпутаты абагульняюць, аналізуюць, дакладваюць». На аснове гэтай інфармацыі інфармацыйна-аналітычнае ўпраўленне Палаты прадстаўнікоў рыхтуе аналітычныя дакументы з мэтай інфармавання кіраўніка дзяржавы, іншых службовых асоб для выкарыстання ў канкрэтнай практычнай рабоце.

Кажучы аб міжнароднай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, спікер паведаміў, што створаны 11 камісій для ўзаемадзеяння з міжнароднымі парламенцкімі дэлегацыямі, 40 груп сяброўства. «Шляхам удзелу ў гэтых мерапрыемствах мы даносім пазіцыю нашай краіны, міралюбівы курс нашай дзяржавы, гаворым пра той адмоўны эфект, які нясуць санкцыі ў адносінах да любой дзяржавы, — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка. — З дапамогай гэтых пляцовак мы ў выніку набываем калі не сяброў, то ва ўсялякім выпадку сваіх прыхільнікаў. Працягваецца работа дэпутатаў у фармаце Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі, Міжпарламенцкай асамблеі СНД, Парламенцкай асамблеі АДКБ. Развіваем кантакты з парламентамі краін Паўднёва-Усходняй Азіі, Афрыкі. Толькі ў гэтым годзе актывізаваны кантакты з парламентамі Пакістана, Ірана, Егіпта, Індыі, іншых краін. Міжнародная дзейнасць парламента накіравана на падтрымку парламенцкімі спосабамі ўсіх тых ініцыятыў і эканамічных дамоўленасцяў, якія рэалізоўваюцца паміж дзяржавамі».

На сустрэчы з Прэзідэнтам Старшыня Палаты прадстаўнікоў падарыў кіраўніку дзяржавы першы экземпляр кнігі «Беларусь адзіная», прысвечанай Дню народнага адзінства. У кнізе сабраны фотадакументы, гістарычныя матэрыялы, якія характарызуюць час, калі існавалі Заходняя і Усходняя Беларусь, калі адбывалася іх уз'яднанне. На канкрэтных прыкладах, матэрыялах паказана, як жылі людзі ў Заходняй Беларусі і як развівалася Усходняя Беларусь, як жылі нашы продкі пад польскай акупацыяй, як ажыццяўляўся працэс уз'яднання. Аўтарамі зборніка з'яўляюцца вядомы краязнаўца, гісторык, калекцыянер, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Ліхадзедаў і Святлана Харужык. Навуковы рэдактар — доктар гістарычных навук, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вячаслаў Даніловіч. Кніга выдадзена на дзвюх мовах — беларускай і рускай. Прэзентацыя выдання адбудзецца 17 верасня — у Дзень народнага адзінства.

# «Паміж В'етнамам і Беларуссю ўстанавіліся вельмі цёплыя, сяброўскія адносіны»

## Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу з міністрам грамадскай бяспекі В'етнама



**Падчас візіту дэлегацыі Міністэрства грамадскай бяспекі В'етнама на чале з кіраўніком ведамства генерал-палкоўнікам Лыонг Там Куангам у Беларусь адбыўся шэраг мерапрыемстваў, звязаных з пашырэннем двухбаковага ўзаемадзеяння ў сілавым блоку. Госці нашай краіны наведалі спецыяльнае падраздзяленне па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», адбылася сустрэча з кіраўніцтвам Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі. У праграме візіту таксама значыліся перагаворы па лініі Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі і Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Галоўным мерапрыемствам візіту в'етнамскай дэлегацыі ў нашу краіну стала сустрэча міністра грамадскай бяспекі В'етнама з Прэзідэнтам Беларусі.**

Найперш Аляксандр Лукашэнка павіншаваў госця Палаца Незалежнасці з вялікім святам для в'етнамскага народа — Днём незалежнасці, які нядаўна адзначаўся ў гэтай краіне. «Гэта свята в'етнамцы заслужылі потам і крывёю, яны за яго змагаліся», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што В'етнам — гэта краіна не толькі ў Азіі, але і ў свеце, якая адбылася і хутка развіваецца.

«Паміж В'етнамам і Беларуссю ўстанавіліся вельмі цёплыя, сяброўскія адносіны, — канстатаваў беларускі лідар. — Наша сяброўства з вамі заснавана на гераічных старонках барацьбы в'етнамскага народа за сваю незалежнасць ужо пасля Другой сусветнай вайны».

Па яго словах, нашы суайчыннікі шмат працавалі ў В'етнаме. «Дапамагалі В'етнаму і ў вайне, і пасля вайны аднаўляць народную гаспадарку, — нагадаў Прэзідэнт. — Мы дагэтуль прытрымліваемся такой жа пазіцыі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што нядаўна (у маі гэтага года) у В'етнаме адбылося важнае палітычнае мерапрыемства — выбары прэзідэнта краіны. У жніўні То Лам быў выбраны яшчэ і на пост генеральнага сакратара Камуністычнай партыі В'етнама. Беларускі лідар папрасіў перадаць свайму калегу самыя цёплыя віншаванні і запрашэнне наведаць Беларусь у любы зручны для яго час.

Кажучы аб развіцці міжнародных адносін, Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў Беларусі і В'етнама падобныя погляды. «Мы — за шматпалярны свет, — падкрэсліў беларускі лідар. — І хочам мы гэтага або не, шматпалярны свет адбудзецца. У гэтай сувязі ў свеце, які моцна мяняецца, вельмі складаным свеце, неадназначным свеце, пытанні бяспекі выходзяць на першае месца. І я вельмі спадзяюся, што ваш візіт у Беларусь будзе садзейнічаць умацаванню нашых адносін і ў сферы бяспекі».

Па словах Прэзідэнта, госць Палаца Незалежнасці добра ведае нашу дзяржаўную палітыку. «Мы, як і раней, прыхільныя вельмі добрым кірункам супрацоўніцтва Беларусі з В'етнамам, — дадаў кіраўнік дзяржавы. — Усё залежыць ад в'етнамскага боку. Мы будзем настолькі актыўныя ў нашых адносінах, наколькі гэта можа сабе дазволіць в'етнамскае кіраўніцтва».

У сваю чаргу міністр грамадскай бяспекі В'етнама пацвердзіў, што цяперашні візіт дэлегацыі В'етнама ў Рэспубліку Беларусь будзе садзейнічаць паглыбленню сяброўскіх адносін не толькі паміж дзвюма краінамі, але і сілавымі органамі Беларусі і В'етнама. Па яго словах, гэты візіт вельмі значны. Лыонг Там Куанг перакананы, што ён стане добрым стымулам для ўмацавання адносін паміж сілавымі ведамствамі дзвюх краін.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## МЗС КНР заявіла аб узрастанні ўплыву і прывабнасці ШАС



Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва прыцягвае ўвагу міжнароднай супольнасці і ўвесь час нарошчвае свой уплыў у свеце. Аб гэтым заявіў намеснік міністра замежных спраў КНР Сунь Вэйдун, паведаміла ТАСС. Ён нагадаў, што пасля прыёму сёлета Беларусі сукупная тэрыторыя дзяржаў — членаў ШАС перавысіла 36 мільёнаў кв. кіламетраў, гэта больш за 65 працэнтаў тэрыторыі еўразійскага кантынента. Пасля саміту ў Астане ў ліпені да Кітая перайшло ратацыйнае старшынства ў ШАС у 2024—2025 гадах, КНР налета правядзе саміт арганізацыі. Як вядома, ШАС аб'ядноўвае 10 дзяржаў-членаў (Беларусь, Індыя, Іран, Казахстан, Кітай, Кіргізія, Пакістан, Расія, Таджыкістан і Узбекістан). Таксама з ШАС узаемадзейнічаюць дзве дзяржавы са статусам назіральніка (Афганістан, Манголія) і 14 партнёраў па дыялогу (Азербайджан, Арменія, Бахрэйн, Егіпет, Камбоджа, Катар, Кувейт, Мальдывы, М'янма, Непал, ААЭ, Саудаўская Аравія, Турцыя і Шры-Ланка).

## Прэзідэнт Ірана заявіў аб планах перанесці сталіцу з Тэгерана



Масуд Пезешкіян заявіў аб планах перанесці сталіцу рэспублікі з Тэгерана да паўднёвых межаў краіны, да берагоў Персідскага заліва. Пра гэта паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на інфармацыйнае агенцтва Fars. «Тэгеран сутыкаецца з праблемамі, для якіх у нас няма рашэння, акрамя як перамясціць сам сталічны цэнтр», — прыводзіць словы Пезешкіяна агенцтва. На яго думку, пакідаць Тэгеран сталіцай становіцца немагчымым з-за шэрагу меркаванняў, у першую чаргу эканамічных. «Немагчыма развіваць краіну, працягваючы цяперашнюю тэндэнцыю. Калі мы хочам і далей прывозіць у Тэгеран з поўдня і мора рэсурсы, перапрацоўваць іх пасля ў прадукцыю і зноў адпраўляць на поўдзень, на экспарт, — гэта будзе зніжаць нашу канкурэнтаздольнасць», — адзначыў прэзідэнт Ірана. Пры гэтым Пезешкіян падкрэсліў, што пасля выбару новага сталічнага цэнтра туды будуць перанесены ўсе дзяржаўныя ведамствы.

## У Францыі ў пратэстах супраць палітыкі Макрона ўзялі ўдзел сотні тысяч чалавек



Акцыя пратэсту левых сіл, якія выступаюць супраць палітыкі прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона і патрабуюць яго адстаўкі, сабрала ў Парыжы, паводле звестак паліцыі, 26 тысяч удзельнікаў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на тэлеканал BFMTV. У той жа час кіраўнік парламенцкай фракцыі партыі «Няскораная Францыя» Мацільда Пана заявіла ў сацсетцы, што ў маніфестацыі ўдзельнічалі 160 тысяч чалавек. Паводле яе слоў, у цэлым па краіне, дзе было запланавана да 150 розных акцый, выйшлі пратэставаць каля 300 тысяч чалавек. Акрамя Парыжа буйныя шэсці прайшлі ў Нанце, Ніцы, Марселі, Рэнэ і іншых буйных гарадах Францыі. Іх удзельнікі абвінавачваюць прэзідэнта краіны ў «сілавым пераваросе» і парушэнні прынцыпаў дэмакратыі. На гэтым фоне заснавальнік левай партыі «Няскораная Францыя» Жан-Люк Меланшон заявіў аб наступленні ў Францыі «права наймацнейшага» і заклікаў прыхільнікаў да «доўгатэрміновай барацьбы» супраць палітыкі прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона.

# ЧЫМ ПАРАДУЕ «НАШ ДОМ»?

**Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Наш дом» арганізавана Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі сумесна з Нацыянальным выставачным цэнтрам «БелЭкспа». Яна вызначыць кірункі рэалізацыі найважнейшых задач, якія стаяць перад галіной, падкрэсліў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Рамашка. На гэта і накіравана шырокая дзелавая праграма, якую, акрамя экспазіцыйнай часткі, прадугледжвае маштабны спецыялізаваны форум.**



## ДРАЙВЕР РАЗВІЦЦЯ ТЭРЫТОРЫЙ

— Міжнародная спецыялізаваная выстава «Наш дом» аб'ядноўвае ўсе сферы жыллёва-камунальнай і гарадской гаспадаркі і з'яўляецца цэнтральнай падзеяй галіны, — падкрэсліла прадстаўнік «БелЭкспа». — Праект не толькі прыцягвае ўвагу вядучых вытворцаў, прадпрыемстваў, якія працуюць у галіне добраўпарадкавання, прафесіяналаў сферы ЖКГ, але і служыць месцам для выбудоўвання цеснага дыялогу са спажыўцом гэтых паслуг.

Сёлета свае распрацоўкі, паслугі і тавары прадставяць таксама звыш сотні прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай сферы з нашай краіны і суседняй Расійскай Федэрацыі. Агульная экспазіцыйная выставачная плошча ўнутры павільёна і пад адкрытым небам складзе 4 тысячы кв. м. Асаблівую ўвагу арганізатары ўдзялілі вулічнай экспазіцыі. Будзе прадстаўлена камунальная тэхніка, прызначаная для добраўпарадкавання гарадоў, навясное абсталяванне для яе, малыя архітэктурныя формы, тавары для добраўпарадкавання і азелянення прыдамавых тэрыторый і дачных участкаў. Кампаніі-ўдзельнікі прадэманструюць свае распрацоўкі, падзеляцца вопытам укаранення іх у працэсы капітальнага рамонту, добраўпарадкавання, аказання жыллёва-камунальных паслуг, абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі.



— Арганізатары падрыхтавалі спецыяльныя прызы пераможцам у трох намінацыях, — распавяла Вольга Красоўская. — Яны будуць вызначаны праз апытанне-галасаванне, па выніках якога тры прадпрыемствы атрымаюць спецыяльныя ўзнагароды.

Сярод наведвальнікаў, якія возьмуць удзел у галасаванні, будзе праведзены розыгрыш прызоў ад арганізатараў, дадала яна. Пераможцаў будуць вызначаць у прамым эфіры ў акаўнце «БелЭкспа» сеткі Instagram. Розыгрыш адбудзецца 20 верасня ў 16 гадзін.

Прафесіяналаў жыллёва-камунальнай сферы чакае насычаная дзелавая праграма. Яна ўключае навукова-практычныя канферэнцыі і семінары, прэзентацыі і рабочыя сустрэчы. У цэнтры ўвагі — інавацыі ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, добрасуседства як драйвер развіцця тэрыторый, павышэнне камунальнай адукаванасці насельніцтва ў рамках рэалізацыі праекта «Школа ЖКГ», абнаўленне сістэм падрыхтоўкі кадраў пад запыты рэальнага сектара эканомікі.

Шырокі шэраг дзелавых мерапрыемстваў пройдзе ў фармаце круглых сталоў. Так, у дзень адкрыцця выстаўкі адбудзецца круглы стол, прысвечаны шляхам эфектыўнага ўзаемадзеяння органаў ЖКГ і насельніцтва. А 19 верасня эксперты ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі правядуць круглы стол «Павышэнне эфектыўнасці работы галіны праз падрыхтоўку кадраў» і яшчэ адно важнае дзелавое мерапрыемства — «Устойлівае кіраванне адходамі: актуальныя выклікі, паспяховыя практыкі і інструменты». У цэлым, эксперты абмяркуюць розныя аспекты і перспектыўныя кірункі развіцця галіны, у тым ліку ўдасканаленне нарматыўна-прававой базы, лічбавую трансфармацыю і аўтаматызацыю працэсаў кіравання гарадской гаспадаркай. Адбудуцца майстар-класы па прымяненні найноўшых распрацовак у сферы ЖКГ і інжынернага абсталявання. Будзе арганізаваны прамы дыялог з прадстаўнікамі выканаўчай улады, Міністэрства ЖКГ, іншых ведамстваў. Спецыяліст нагадала: выстаўка «Наш дом» разгорне сваю экспазіцыю на Пераможцаў, 14 у павільёне «БелЭкспа». Першыя два дні выстава будзе працаваць з 10.00 да 18.00, а 20 верасня — з 10.00 да 16.00. Уваход вольны пасля рэгістрацыі на сайце мерапрыемства ці непасрэдна пры ўваходзе — там будуць усталяваны тэрміналы.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

## ЦАНА, ЯКАСЦЬ І ДАСТУПНАСЦЬ

Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Наш дом» арганізавана Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі сумесна з Нацыянальным выставачным цэнтрам «БелЭкспа». Яна вызначыць кірункі рэалізацыі найважнейшых задач, якія стаяць перад галіной, падкрэсліў **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй РАМАШКА**. На гэта і накіравана шырокая дзелавая праграма, якую, акрамя экспазіцыйнай часткі, прадугледжвае маштабны спецыялізаваны форум.

— Рыхтуемся абмеркаваць шэраг актуальных для галіны пытанняў. Гэта і лічбавізацыя жыллёва-камунальнай гаспадаркі з акцэнтам на лічбавізацыю сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення. Гэта, вядома, і пытанні рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў у часткі добраўпарадкавання гарадскога асяроддзя і прыдамавых тэрыторый, — звярнуў увагу намеснік міністра. — Дарэчы, для ўдзелу ў круглым стале па дадзеным пытанні чакаем шырокую дэлегацыю з многіх рэгіёнаў Расіі. Не застануцца ўбаку і пытанні кадравага забеспячэння галіны. Прадугледжана таксама секцыя па цвёрдых камунальных адходах, у рамках якой плануем знайсці канкрэтныя падыходы па рацыянальнай перапрацоўцы цвёрдых адходаў, іх уключэнні ў вытворчасць другасных матэрыяльных рэсурсаў. Дарэчы, адной з цікавых актыўнасцяў цяперашняй выстаўкі стане магчымасць абмяняць старыя рэчы — пластык, бытавыя і электратавары, якія страцілі спажывецкія якасці, — на памятныя сувеніры і прыемныя падарункі.

Жыллёва-камунальная гаспадарка сёння — гэта галіна, якая дынамічна развіваецца і аб'ядноўвае больш за 360 працоўных калектываў, у руках якіх сканцэнтравана амаль дзясятая частка асноўных фондаў краіны, расказаў намеснік міністра ЖКГ. Гэта складаны шматгаліновы вытворча-тэхнічны комплекс. Штодзень спажыўцам краіны падаецца больш за 1 млн куб. м вады, прафесійна абслугоўваецца звыш 120 млн кв. м жыллёвага фонду, вывозіцца 60 тыс. куб. м адходаў. Сярод найбольш актуальных пытанняў, якія стаяць перад галіной ЖКГ, — добраўпарадкаванне тэрыторый, у тым ліку вулічна-дарожнай сеткі ў населеных пунктах, даступнасць якаснай пітной вады ў сельскай мясцовасці, эфектыўнасць і надзейнасць цеплазабеспячэння, якасць ачысткі сцёкавых вод і надзейнасць сістэм водаадвядзення.

І, галоўнае, сістэма жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў рабоце з насельніцтвам павінна перайсці ад узаемаадносін, заснаваных на зваротах і скаргах, да адносін па прынцыпе «пастаўшчык — спажывец паслуг», у аснове якіх будуць ляжаць суадносіны цаны і якасці паслуг пры роўнай іх даступнасці, падкрэсліў Андрэй Рамашка.

— Для вырашэння ўсіх гэтых пытанняў неабходна штодзень нарошчваць аб'ёмы выкананых работ па рамонце вулічна-дарожнай сеткі, развіваць будаўніцтва сетак водазабеспячэння і водаадвядзення ў сельскіх населеных пунктах і аграгарадках, зніжаць бюджэтную нагрузку на субсідзіраванне цеплавой энергіі шляхам рэканструкцыі неэфектыўных кацельняў, забяспечыць будаўніцтва не менш за 70 ачышчальных збудаванняў сцёкавых вод, — адзначыў ён.

## ТЫЯ, ХТО СТВАРАЕ ЎТУЛЬНАСЦЬ

— Людзі — асноўны капітал любой арганізацыі, — перакана на **дырэктар дзяржаўнага навучальнага цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў «Жылкам» Кацярына ГАРБАЧОВА**. У галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі працуе каля 130 тыс. чалавек, расказала яна:

— Гэта каманда прафесіяналаў, якія штодня сваёй працай пацвярджаюць, што наша рэспубліка — самая чыстая краіна, дзе жывуць добразычлівыя людзі. Пра гэта могуць меркаваць як грамадзяне Беларусі, так і госці краіны, якім таксама аказваюцца жыллёва-камунальныя паслугі, — сказала дырэктар навучальнага цэнтра.



Пытанні прытоку ў сферу жыллёва-камунальнай гаспадаркі высокапрафесійных кадраў будуць абмеркаваны ў другі дзень работы выстаўкі «Наш дом» у рамках круглага стала «Павышэнне эфектыўнасці работы галіны ЖКГ праз падрыхтоўку кадраў». Акрамя таго падчас трэнінгу адбудзецца тэсціраванне патэнцыяльных работнікаў сферы ЖКГ, прайсці яго змогуць усе ахвотныя. Трэнінг стане рэсурсным цэнтрам па падрыхтоўцы дзяржаўных служачых, якія ў далейшым стануць спецыялістамі ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Акрамя тэсціравання будуць арганізаваны зносіны патэнцыяльных спецыялістаў ЖКГ з псіхолагам і будучымі работадаўцамі. Магчыма, адразу будуць прапанаваны вакансіі. Але магчыма і ўключэнне ў кадравы рэзерв на дзяржаўныя пасады ў міністэрства, — праанансавала цікавае мерапрыемства кіраўнік цэнтра «Жылкам».

Выстаўка «Наш дом» дасць старт і яшчэ аднаму праекту — унікальнай праграме па падрыхтоўцы кадраў: яна арганізавана пры падтрымцы Мінскай гарадской ЖКГ.

— Запрашаем усіх прайсці навучанне ў дзяржаўным цэнтры «Жылкам» за кошт сродкаў будучага работадаўца, каб стаць членам каманды ЖКГ, — канкрэтызавала кіраўнік цэнтра.

Пасля навучання спецыялістам гарантуецца першае рабочае месца (у сталічных арганізацыях на пасады майстроў эксплуатацыі жыллёвага фонду), а на час навучання выдзяляецца пражыванне. Акрамя таго, сама вучэбная праграма вельмі цікавая, расказала спецыяліст. Заключыць дагавор на навучанне можна будзе на пляцоўцы Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Наш дом».

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# «САПРАЎДНЫЯ СЯБРЫ БЛІЗКІЯ НАВАТ УДАЛЕЧЫНІ АДЗІН АД АДНАГО»



## У чым сакрэт плённага беларуска-кітайскага супрацоўніцтва?

**Беларусь і Кітай узмацняюць узаемадзеянне па ўсіх напрамках. Гэтую станоўчую тэндэнцыю адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се Сяаюн на сяброўскай сустрэчы ў Мінску з нагоды заканчэння сваёй дыпламатычнай місіі ў Беларусі.**



— У імгненне вока праляцелі чатыры незабыўныя гады маёй работы ў Мінску. На працягу гэтага часу я глыбока адчуў добрыя адносіны да Кітая і актыўную падтрымку з боку ўрада Беларусі і ўсіх колаў беларускага грамадства. Разам мы сталі сведкамі таго, як адносіны паміж дзвюма краінамі здзейснілі гістарычны скачок, — падкрэсліў кітайскі дыпламат. — За апошнія чатыры гады палітычны ўзаемадавер паміж дзвюма краінамі бесперапынна ўмацоўваўся, дыпламатыя кіраўнікоў дзяржаў адыгрывае стратэгічную вядучую ролю. Старшыня КНР Сі Цзіньпін і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падтрымліваюць цесныя кантакты. Яны правялі чатыры двухбаковыя сустрэчы запар, стоячы каля руля кіравання развіццём адносін паміж дзвюма краінамі. Дзякуючы агульнаму клопату кіраўнікоў дзвюх дзяржаў і сумесным намаганням абодвух бакоў, кітайска-беларуские адносіны павысілі сваю якасць і ўзровень, паміж краінамі ўстаноўлены адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства.

Як вядома, нядаўна, праз 17 гадоў, прэм'ер Дзяржсавета Кітая зноў наведаў Беларусь, што надало новы імпульс далейшай рэалізацыі дамоўленасцяў, якія дасягнуты кіраўнікамі дзвюх дзяржаў, прасоўванню паглыбленага развіцця прагматычнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

— Разам мы сталі сведкамі таго, што міжнароднае супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі выйшла на новы ўзровень, — адзначыў Се Сяаюн. — Кітай заўсёды цвёрда падтрымлівае Беларусь у абароне дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальнай годнасці, выступае супраць умяшання знешніх сіл ва ўнутраныя справы, супраць неабгрунтаваных аднабаковых санкцый, а таксама падтрымлівае афіцыйнае ўступленне Беларусі ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва.

Наша краіна таксама аказвае Кітаю цвёрдую падтрымку па пытаннях, якія датычацца яго карэнных інтарэсаў і важных заклапочанасцяў, уключаючы пытанне, звязанае з Тайванем, Сіньцзянам і Сянганам, а таксама актыўна ўдзельнічае ў сумеснай рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях», Ініцыятывы па глабальным развіцці, Ініцыятывы па глабальнай бяспецы, Ініцыятывы глабальнай цывілізацыі, а таксама іншых ідэях і канцэпцыях, якія вылучаны Кітаем.

— Краіны ўзмацняюць каардынацыю ў рамках міжнародных шматбаковых механізмаў, такіх як Арганізацыя Аб'яднаных Нацый і Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, ажыццяўляюць сапраўдную шматбаковасць, сумесна абараняюць аанацэнтрычную міжнародную сістэму і міжнародны парадак, заснаваны на міжнародным праве, адстойваюць суверэнітэт, бяспеку, інтарэсы развіцця абодвух бакоў, а таксама міжнародную справядлівасць і раўнапраўе, — адзначыў кіраўнік дыпламатычнай місіі.

Беларусь і Кітай накіраваны на пабудову справядлівага і раўнапраўнага светапарадку. Аб гэтым заявіў **першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей ЛУКАШЭВІЧ:**

— Кожны пасол, завяршаючы сваю місію, азіраецца на некалькі гадоў назад і падводзіць вынікі работы. Наколькі палепшыліся адносіны, вырас тавараабарот, павялічылася колькасць праектаў паміж нашымі краінамі. Рэчаіснасць такая: не ўсе пасольствы могуць сказаць, што іх дзейнасць была стваральнай, што прыкладзеныя намаганні былі накіраваны на развіццё супрацоўніцтва з Беларуссю, што менавіта яны засеялі поле добрымі ідэямі, якія змогуць даць усходы на карысць двухбаковага партнёрства.



Паслу Се Сяаюну, які ўзначальваў дыпламатычную місію Кітая ў Беларусі з 2020 года, несумненна, ёсць чым ганарыцца. Яго першыя крокі ў Беларусі прыпалі на няпросты перыяд — разгар эпідэміі ковіду. Як насамрэч «жалезныя браты», Беларусь і Кітай паслядоўна аказвалі адзін аднаму дапамогу ў пераадоленні цяжкасцяў. І здолелі годна адказаць на гэтыя выклікі.

Паводле слоў першага намесніка кіраўніка беларускага знешнепалітычнага ведамства, былі створаны ўсе ўмовы для актыўных зносін і поспеху дыпламатыі лідараў нашых краін — Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні КНР Сі Цзіньпіна.

— Два гады таму, у верасні 2022-га, нашы краіны прынялі сумесную дэкларацыю аб устанаўленні найвышэйшага ў гісторыі ўзроўню адносін — усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. У гэтых словах закладзены нашы поспехі і дасягненні ў палітычным, гандлёва-эканамічным, гуманітарным супрацоўніцтве, — падкрэсліў Сяргей Лукашэвіч.

Першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі звярнуў увагу на тое, што з 2020-га года Кітай — другі найбуйнейшы гандлёвы партнёр Беларусі. Нягледзячы на ўсе выклікі, работа, якая праводзіцца нашымі краінамі, дазволіла з году ў год пераўзыходзіць ранейшыя рэкорды тавараабароту, а таксама развіваць наш сумесны праект, жамчужыну «Аднаго пояса, аднаго шляху» — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

— Фактычна сканструявана новая мадэль эканамічнага ўзаемадзеяння, забяспечаны выхад на якасна новы ўзровень партнёрства, укаранёны новыя формы і міжгаліновыя механізмы, — падкрэсліў Сяргей Лукашэвіч.

Першы намеснік міністра замежных спраў падзякаваў паслу за падтрымку рэалізацыі праекта тэхніка-эканамічнай дапамогі Кітая, ключавымі аб'ектамі сталі нацыянальны футбольны стадыён і басейн міжнароднага стандарту, якія з'яўляюцца ўпрыгожаннем беларускай сталіцы.

— Мы высока цэнім ролю пасольства ў развіцці беларуска-кітайскага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Беларусь і Кітай сур'ёзна рушылі наперад у гэтым кірунку, — адзначыў Сяргей Лукашэвіч. — На працягу трох гадоў нашы галіны і правінцыі правялі больш за 200 мерапрыемстваў і рэалізавалі рознабаковыя праекты супрацоўніцтва.

Напрыклад, Гомельшчына развівае партнёрствы з правінцыямі Сычуань, Хэбэй, Аўтаномным раёнам Унутраная Манголія, Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёнам. Яшчэ дзесяць пагадненняў падпісана на ўзроўні гарадоў.

— За час вашай дыпмісіі ў Беларусі статус міжрэгіянальнага супрацоўніцтва з кітайскімі рэгіёнамі павышаны да ўзроўню пабрацімства, — адзначыў на сустрэчы **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.** — Перакананы, што наша ўзаемадзеянне будзе і ў далейшым паспяхова развівацца на аснове ўзаемавыгаднага і плённага супрацоўніцтва на карысць жыхароў нашых дзяржаў.

Акрамя таго, дзякуючы актыўнай рабоце абодвух бакоў і асабістай падтрымцы Се Сяаюна заснавана Асацыяцыя ўніверсітэтаў Беларусі і Кітая. Паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі дзвюх краін падпісаны сотні прамых дагавораў аб супрацоўніцтве. Створаны ўмовы для паспяховых сумесных адукацыйных праектаў і значнага павелічэння студэнцкіх і навуковых абменаў.

— Беларусь цалкам падтрымлівае рэалізацыю кітайскай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» і трыадзіную канцэпцыю Ініцыятывы глабальнай бяспекі, развіцця і цывілізацыі. Мы ўдзячны кітайскаму боку і паслу за ўсебаковую падтрымку ва ўступленні Беларусі ў ШАС і прасоўванне нашай заяўкі на статус дзяржавы-партнёра БРІКС, — падкрэсліў першы намеснік міністра замежных спраў.

Як адзначыў Сяргей Лукашэвіч, «камандзіроўка ў Мінск, якая пачыналася для Се Сяаюна ў 2020 годзе, у трывожны час пандэміі, сёлета сімвалічна завяршаецца пад урачыстыя фанфары гістарычнага афіцыйнага візіту ў Мінск прэм'ера Дзяржсавета КНР Лі Цяна. Хачу шчыра падзякаваць паслу за яго ўклад ва ўмацаванне беларуска-кітайскага сяброўства і раскрыццё патэнцыялу нашага ўзаемадзеяння. Упэўнены, што Беларусь назаўжды пасялілася ў яго сэрцы, і ён працягне заставацца правадніком усепагоднага сяброўства і «жалезнага братэрства» паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай».

Се Сяаюн заўважыў, што з сумам развітваецца з Беларуссю. «Дзе б я ні знаходзіўся ў далейшым, працягну рабіць усё магчымае для развіцця кітайска-беларускага сяброўства, — заўважыў кітайскі дыпламат. — Для мяне вялікі гонар быць накіраваным у якасці пасла ў брацкую Беларусь і стаць сведкам і ўдзельнікам гістарычнага працэсу развіцця кітайска-беларускіх адносін. Я вельмі рады, што за апошнія чатыры гады яны захавалі высокі ўзровень і дасягнулі плённых вынікаў, — падкрэсліў кітайскі дыпламат. — Карыстаючыся выпадкам, хацеў бы падзякаваць ураду і прадстаўнікам розных колаў Беларусі, калегам з дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў Беларусі, прадпрыемствам з удзелам кітайскага капіталу, кітайскім студэнтам, якія навучаюцца ў Беларусі і кітайскім суайчыннікам, а таксама ўсяму калектыву Пасольства Кітая ў Беларусі. Вынікі, якіх я дасягнуў у сваёй рабоце за апошнія чатыры гады, неаддзельныя ад вашага разумення і падтрымкі».

Пасол адзначыў, што сапраўдныя сябры блізкія нават удалечыні адзін ад аднаго: «Я буду заўсёды памятаць Беларусь і шанаваць сяброўства з беларускім народам. Жадаю працвітання і магутнасці Беларусі, а таксама шчасця і дабрабыту беларускаму народу».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# «НА СЦЭНЕ СЁННЯ СПЯВАЕ ДУША НАРОДА»



Крысціна МАКСІМОВІЧ.




Алена ПЯТРОЎСКАЯ.



**«Душэўны фестываль», які прайшоў у Беларусі ўпершыню на мінулых выхадных, стаў сапраўдным святам для ўсіх аматараў сучаснага народнага фальклору, душэўнага шансону і рэтра. Гэты ўнікальны праект аб'яднаў калектывы народнай творчасці і самых яркіх і знакамітых выканаўцаў у жанры поп-фолк. Арганізатары мерапрыемства — «Музычная медыякампанія» — падрыхтавалі надзвычай насычаную праграму.**



У першы дзень зладзілі Міжнародны конкурс народных выканальніцкіх мастацтваў «Душа народная», пераможцай, уладальніцай Гран-пры якога стала Крысціна Максімовіч, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. А ўвечары ў Палацы спорту адбыўся канцэрт «Самыя душэўныя песні» з удзелам вядомых беларускіх і расійскіх зорак: на сцэну выйшлі Сяргей Трафімаў, Сяргей Вайтэнка, Аляксей Пятрухін, Вікторыя Алешка і многія іншыя артысты.

Атмасфера фестывалю спадабалася ўсім яго ўдзельнікам. Гэта адчувалася па невычэрпнай энергіі і цудоўным настроі, што луналі ў паветры на працягу двух дзён.

На другі дзень у рамках «Душэўнага фестывалю» праходзіў канцэрт «Душа народная», падчас якога прагучалі творы з выкарыстаннем народных інструментаў, песні ў народнай манеры і поп-фолк-кампазіцыі. Сярод запрошаных артыстаў — Тацццяна Куртукова, Алена Васілёк, Аляксей Пятрухін, Алена Пятроўская, Аляксандра Мелех, ансамбль «Бабкіны ўнукі» і іншыя.

На пачатку канцэрта **салістка ансамбля «Бяседа» Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** павітала беларускага гледача і гасцей сталіцы, а таксама распавяла аб прэм'еры песні:

— У Палацы спорту шырока і раздольна праходзіць шыкоўны канцэрт, — падзялілася ўражаннямі суразмоўца. — Вельмі рада, што народная песня прагучыць на ўсю нашу славянскую прастору. Мы падрыхтавалі і ўжо вядомыя народныя хіты, а дакладней папуры, а таксама прэм'еры. Сёння прагучыць адна з іх — «Запаветны бераг», музыку для якой напісаў кампазітар, народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны. Гэта песня апявае нашу Беларусь, з яе рэкамі, азёрамі і прыгажосцю. З нецярпеннем у гэты сонечны восеньскі дзень чакаем сустрэчы з дарагім гледачом. Ён — галоўнае для артыста. Для гледача спяваем, танчым, пішам новыя песні.

Уражаннямі падчас канцэрта таксама падзялілася **Алена ВАСІЛЁК, расійская артыстка, паэтэса, кампазітар:**

— Столькі людзей сёння задзейнічана — незлічонае мноства. Фестываль праходзіць на найвышэйшым узроўні: выдатны гук і святло на сцэне, цудоўная атмасфера. Я шчаслівая, што бяру ўдзел у ім. Няхай ён праходзіць кожны год, бо, як я бачу, на сцэне сёння спявае душа народа.

Аб тым, чаму неабходна зрабіць правядзенне «Душэўнага фестывалю» традыцыйным, а таксама пра эмоцыі ад убачанага падчас экскурсіі па сталіцы распавёў **заслужаны артыст Расіі Сяргей ВАЙТЭНКА:**

— Праводзіць фестываль неабходна, таму што ён падтрымлівае нацыянальную культуру, што з'яўляецца асновай, падмуркам, на якім трымаецца любая нацыя. Да таго ж у Мінску фестывалю такога фармату раней не было, таму, мне здаецца, яго абавязкова трэба арганізоўваць. Са сцэны сёння прагучыць прэм'ера песні, напісанай мной сумесна з беларускім аўтарам Ганнай Сялук «Душа народная», якая была створана якраз напярэдадні. Спадзяюся, што яна стане хітом, бо песня атрымалася цёплай і забіяцкай, — адзначыў артыст. — Днём мы пабывалі каля Нацыянальнай бібліятэкі, у гістарычным цэнтры Мінска, убачылі Востраў слёз. І мы проста ў захапленні, бо ідэальная чысціня і парадак уражваюць. Твары людзей, усмешкі і вочы. Вы людзі са светлай душой і чыстым позіркам.

А вось **расійская артыстка з беларускімі каранямі Алена ПЯТРОЎСКАЯ** на «Душэўным фестывалі» скарыла слухачоў выкананнем народнай «Купалінкі»:

— Выступаць на Радзіме і сцэны дапамагаюць, — падзялілася ўражаннямі артыстка. — «Купалінку», як правіла, выконваю на розных фестывалях. Напрыклад, нядаўна выступіла з гэтай кампазіцыяй на «Добровидении» ў Санкт-Пецярбургу. На сваіх сольных канцэртах заўсёды выконваю беларускія песні, але часцей за ўсё — фальклор. Менавіта такія песні мне спявала бабуля, дзякуючы чаму я і стала артысткай. Дома ў нас гучалі кампазіцыі Людмілы Зыкінай, Валянціны Талкуновай, Ганны Герман. Пасля я перапявала іх песні, потым сталі супрацоўнічаць з кампазітарамі, з'явіўся свой матэрыял, і цяпер працую над сёмым альбомам. Дарэчы, калі выступаю ў Расіі, мне кажуць, што я самая душэўная спявачка родам з Беларусі.

**Выканаўца хіта «Матушка», які сёння сабраў мільёны праглядаў і праслухоўванняў, а таксама стаў самай папулярнай песняй 2024 года, Таццяна КУРТУКОВА** выказала падзяку за запрашэнне на фестываль:

— Для мяне вялікі падарунак — наведаць Мінск, дзе я вельмі даўно не была, — адзначыла артыстка. — Горад прыгожы, чысты, як пра яго ўсе і распавядаюць. Усюды душэўная атмасфера. Мне сёння ўдалося па многіх месцах праехаць, паглядзець — вельмі спадабалася. І, канешне, гарачы прыём гледача, што вельмі прыемна, заўсёды зараджае на добрае выступленне. Гэта становіцца добрай традыцыяй — збірацца дружнай кампаніяй, шматтысячнай аўдыторыяй, каб выканаць разам любімыя песні.

На пытанне журналістаў аб тым, ці плануе выканаўца падарыць слухачам песню на беларускай мове, яна адказала так:

— Я камунікую з калегамі, якія знаёмыя з фальклорнай традыцыяй Беларусі. Мне вельмі цікавая ваша народная спеўная традыцыя, ёсць з кім пракансультавацца па гэтым пытанні, таму я з радасцю гатовая падарыць гледачам песню на беларускай мове.

Напрыканцы вечара аматараў мерапрыемства чакаў маштабны канцэрт-дыскатэка «Танцпляцоўка». Выступалі Аляксей Глызін, Дзмітрый Санковіч, група «Cosa Nostra» і многія іншыя. Упэўнены, двухдзённы фестываль надоўга застанецца ў сэрцах усіх: і арганізатараў, і гледачоў, і артыстаў. Да наступнага года!



Таццяна КУРТУКОВА і Алена ВАСІЛЁК.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**фота аўтара і БелТА.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «МОГОТЕКС», г. Могилев, ул. Гришина, 87. УНП 700116054 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронного аукциона**

**Здание столовой**

(назначение: здание специализированное для общественного питания, **1908 кв. м,** инв. номер 700/С-75383) по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гришина, 87**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,5366 га,** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 17.07.2064) для обслуживания здания столовой

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 376 320,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)
Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **2 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 23.09.2024.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.09.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-60-11.

**Лот № 1.** Не завершенный строительством законсервированный жилой дом (срок консервации истек): капитальное строение (процент готовности 11 %: фундамент бетон; площадь застройки 175 кв. м, наружная площадь 0 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000001010142 площадью 0,0989 га в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Лесопарковая, 22.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок)**: 27595,36 (11969,16/15625,20) бел. руб.**
**Задаток: 2759,53** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 43,37 %

**Лот № 2.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: капитальное строение (процент готовности 14 %: фундамент - бетон; площадь застройки 33 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000001011497 площадью 0,0917 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пер. 2-й Приозерный, 4.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **12477,25 (1619,97/10857,28) бел. руб.**
**Задаток: 1247,72 бел. руб.** Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 12,98 %

**Лот № 3.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: капитальное строение (процент готовности 6 %: фундамент железобетонные сваи; площадь застройки 108 кв. м) и земельный участок с кадастровым № 240100000001010852 площадью 0,0908 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, 1-я Магистральная, 18.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т.ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **14897,91 (4147,19/10750,72)** бел. руб.
**Задаток: 1489,79** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 27,84 %

**Лот № 4.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: капитальное строение (процент готовности 12 %: фундамент – бетон; площадь застройки 36 кв. м,) и земельный участок с кадастровым № 240100000001010316 площадью 0,0994 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Магистральная, 43.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. незавершенный строительством жилой дом/зем. участок): **14496,26 (2727,30/11768,96) бел. руб.**
**Задаток: 1449,62** бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 18,81 %

**Лот № 5.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом: капитальное строение (процент готовности 6 %: фундамент – железобетон, сваи; стены – бревно, площадь застройки 73 кв. м,) и земельный участок с кадастровым № 240100000001012079 площадью 0,0947 га в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Фестивальная, 6.
**Начальная цена предмета аукциона (**в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **19503,82 (8291,34/11212,48) бел. руб.**
**Задаток: 1950,38 бел. руб.** Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 42,51 %

**Дата, время и место проведения аукциона: 14.10.2024 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 11.09.2024 до 17.30 11.10.2024 в рабочие дни по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**

**Задаток перечисляется на р/с:** BY14AKBB36423020002802000000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300200386, код операции: 40901 (перечисление гарантийного взноса), получатель платежа: Витебский горисполком.
**Условия для победителя аукциона либо единственного участника**: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в течение 2 месяцев со дня утверждения протокола аукциона обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома), обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельных участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь, негосударственных юридических лиц Республики Беларусь), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность; представителем гражданина РБ – доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица без нотариального засвидетельствования, копии документов подтверждающих гос.регистрацию юр.лица, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Предмет торгов:**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным № 250/С36217, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание хозяйственно-бытовое. Общая площадь 97,7 кв. м, адрес: Витебская область, Полоцкий р-н, Вороничский с/с, 1, в 2 км к юго-западу от д. Заскорки. Количество этажей 1 шт. Год постройки 2009. Составные части и принадлежности: погреб. Техническое описание: фундамент – бетонный; наружные, внутренние стены – бетонные блоки оштукатурены, окрашены; перегородки – блоки оштукатурены, окрашены, перекрытия – чердачные, деревянные; крыша – металлочерепица; полы – бетонные, ковролин, плитка; проемы оконные – стеклоблоки, ПВХ; проемы дверные – МДФ, ПВХ, металлические, отделочные работы: наружная отделка стен – штукатурка, окраска; внутренняя отделка – штукатурка, окраска, облицовка плиткой; отопление – печное, электроснабжение – открытая проводка, водопровод, канализация – местные; горячее водоснабжение – электронагреватель, ванные (души) – есть; газоснабжение – есть; вентиляция – естественная. Прочие: бетонный погреб, площадью 6 кв. м, объем – 13 куб. м, есть электричество. Ограничения (обременения) прав: арест, наложенный Управлением Следственного комитета РБ по Витебской области от 24.08.2023. Объект недвижимости расположен на земельном участке с кадастровым номером 223881900001000001 (доля 1/1), площадь 0,7 га (договор аренды от 20.07.2023 № 0729/70, срок действия по 13.07.2073). Назначение – земельный участок для строительства и обслуживания базы отдыха на озере Вороничи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в прибрежных полосах рек и водоемов, в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), площадь – 0,7 га. Капитальное строение с инвентарным № 250/С31806, назначение – здание гостиниц, мотелей, наименование – дом для отдыха. Общая площадь 60,4 кв. м. Адрес: Витебская область, Полоцкий р-н, Вороничский с/с, 1/1, в 2 км к юго-западу от д. Заскорки. Количество этажей 1 шт. Год постройки 1981. Год реконструкции – 2009. Техническое описание: фундамент – бетонный; наружные, внутренние, капитальные стены – кирпичные, штукатурены, окрашены; перегородки – кирпичные, перекрытия – чердачные, железобетонное; крыша – рулонная; полы – плитка; проемы оконные – стеклоблоки, ПВХ; проемы дверные – деревянные, ПВХ, металлические; отделочные работы: наружная отделка стен – штукатурка, окраска; внутренняя отделка – штукатурка, окраска, облицовка плиткой; отопление – электрообогрев, электроснабжение – скрытая проводка, водопровод, канализация – местные; горячее водоснабжение – электроводонагреватель, ванные (души) – есть; газоснабжение – есть; вентиляция – естественная. Ограничения (обременения) прав: арест, наложенный Управлением Следственного комитета РБ по Витебской области от 24.08.2023. Объект недвижимости расположен на земельном участке с кадастровым номером 223881900001000001 (доля 1/1), площадь 0,7 га (договор аренды от 20.07.2023 № 0729/70, срок действия по 13.07.2073). Назначение – земельный участок для строительства и обслуживания базы отдыха на озере Вороничи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в прибрежных полосах рек и водоемов, в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), площадь – 0,7 га. Капитальное строение с инвентарным № 250/С36218, назначение – здание гостиниц, мотелей, Наименование – дом для отдыха. Общая площадь 184,1 кв. м. Адрес: Витебская область, Полоцкий р-н, Вороничский с/с, 1/2, в 2 км к юго-западу от д. Заскорки. Количество этажей – 3 шт., количество подземных этажей – 1 шт. Год постройки 2009. Составные части и принадлежности: подвал площадь 84 кв. м (произведена закладка оконного проема); терраса – площадь 84 кв. м; беседка площадь 6 кв. м; навес – площадь 21 кв. м (металлические конструкции повреждены); навес – площадь 13 кв. м; пирс площадь 98 кв. м; колодец площадь 1 кв. м железобетонные кольца, глубиной 4 м; ограждение – металлическая сетка длинной 145,8 м, высотой 4,95 м; ворота – металлические (размер не указан); колодец канализационный – железобетонные кольца; дворовое покрытие площадь 881 кв. м – бетонная плитка 1712 кв. м. Техническое описание: фундамент– бетонный; наружные, внутренние, капитальные стены – бетонные блоки оштукатурены, окрашены; перекрытия: чердачные, междуэтажные, подвальные железобетонные; крыша – металлочерепица; полы – плиточные, бетонные; проемы оконные – стеклопакеты ПВХ; проемы дверные – деревянные, стеклянные, металлические; наружная отделка стен – оштукатурены, окрашены; внутренняя отделка – облицовка плиткой, окраска, штукатурка; отопление – электрообогрев, электроснабжение – открытая проводка, скрытая проводка; водопровод, канализация – местные; горячее водоснабжение – электроводонагреватель, ванные (души) – есть; вентиляция – принудительная. Ограничения (обременения) прав: арест, наложенный Управлением Следственного комитета РБ по Витебской области от 24.08.2023. Объект недвижимости расположен на земельном участке с кадастровым номером 223881900001000001 (доля 1/1), площадь 0,7 га (договор аренды от 20.07.2023 № 0729/70, срок действия по 13.07.2073). Назначение – земельный участок для строительства и обслуживания базы отдыха на озере Вороничи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в прибрежных полосах рек и водоемов, в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), площадь – 0,7 га.

**Нач. цена продажи имущества: 463 680 белорусских рублей и 00 копеек. Размер задатка: 46 368 белорусских рублей 00 копеек.**

**Условия:**

1. Участник аукциона, выигравший торги, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе предмета торгов не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 рабочих дней. Оплата стоимости приобретенного на аукционе недвижимого имущества иностранными физическими и юридическими лицами осуществляется в установленном порядке за белорусские рубли или за иностранную валюту по официальному курсу белорусского рубля по отношению к иностранной валюте, установленному Национальным банком на дату платежа в соответствии с валютным законодательством.

2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе предмет торгов осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

3.На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. На единственного участника распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63.

Для участия в аукционе приглашаются резиденты РБ и нерезиденты РБ, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток, предоставили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона www.marketvit.by.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK3012000 1093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Повторный аукцион состоится 27.09.2024 в 15.00** по адресу: 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Срок подачи заявления и документов: с 11.09.2024 в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 4).

Последний срок подачи заявления и прилагаемых к нему документов **26.09.2024 до 17.30.**

Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с имеющейся документацией на предмет торгов, а также возможность осмотра предмета торгов на местности.

**Телефон для справок: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.**

Сацыяльны аспект

# АЎТАКРАМА ЦІ СТАЦЫЯНАРНЫ МАГАЗІН?

## Заметкі на палях выязной сесіі і разважанні каля гандлёвай машыны

**Аўтакрама, як звычайна, прыйшла з невялікім спазненнем, што цалкам зразумела: да гэтай вёскі яна паспела абысці з дзясятак населеных пунктаў. Яшчэ трэба ўлічыць, што абсалютная большасць пакупнікоў магазіна на колах — людзі пажылыя: пакуль згадаюць патрэбныя пакупкі, пакуль грошы палічаць... Пачакаць лішнюю хвіліну для пакупнікоў не праблема, а вось асартымент магазіна на колах, як той казаў, пакідае жадаць лепшага і вельмі нават лепшага. Папулярных у гаспадынь курыных ножак-спінак няма, пра марожанае не пытайся, фаршу і некаторых іншых патрэбных для прыгатавання абеду прадуктаў даўно не было.**



Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

### КАЛЯ АЎТАКРАМЫ

Гэта карцінка з натуры жыцця адной з вёсак Камянецкага раёна. Здабыткам названай аўтакрамы, несумненна, з'яўляецца яе прадавец — надзвычай ветлівая, цярплівая, уважлівая жанчына. Адной з прычын такой беднасці асартыменту яна называе адсутнасць маразільнай камеры. У адносна невялікі халадзільнік ледзьве змяшчаюцца малочныя прадукты, каўбасы, гатовыя мясныя вырабы ў колькасці, патрэбнай для ўсіх вёсак. Малако-хлеб ёсць, кандытарскія вырабы, агародніна. А ўжо з выбарам ды пералікам асабліва разумваць не даводзіцца. Таму надзвычай часта на пытаннне пакупнікоў гучыць прывычнае: «Няма».

Яно і зразумела. Машына, якая забяспечвае гандлем вёскі высокаўскай зоны названага раёна, старая, гандлёвае памяшканне ўнутры кузава невялікае і не надта зручнае. Работа прадаўца тут вельмі нялёгкая. Мноства тавараў трэба браць са скрыняў, якія размешчаны на падлозе, а падаваць пакупкі, браць грошы, даваць рэшту можна толькі згінаючыся ледзь не ў тры пагібелі, бо людзі стаяць на зямлі, а машына даволі высокая.

Праўда, у сістэме спажыўкааперацыі ёсць новыя машыны, у якіх узровень абслугоўвання на некалькі парадкаў вышэйшы. Там маюцца вітрыны, на якіх можна разгледзець тавары з цэннікамі. У павільёне дастакова халадзільнага абсталявання, таму можна прывезці шмат прадуктаў, нават такую раскошу, як марожанае летам. У новых магазінах на колах бывае нават невялікая прамысловая група: мыйныя сродкі, прадметы гігіены, пра што нашым пакупнікам нават марыць не даводзіцца.

### НЯРОЎНЫЯ ЎМОВЫ

Але ж такая машына цяпер каштуе каля 250 тысяч рублёў. Інфармацыю агучвалі на выязной сесіі Брэсцкага абласнога Савета гэтым летам. Зразумела, што сума вялікая, і замяніць гандлёвы аўтапарк цалкам арганізацыям спажыўкааперацыі не выпадае. А пакуль новых машын не хапае, на лінію выходзяць старыя. І тут ужо каму пашанцуе. Жыхарам асобных вёсак даводзіцца мірыцца з такой сітуацыяй гадамі. А з другога боку, яны жывуць тут і цяпер. Яны такія ж пенсіянеры калгасна-саўгаснай вытворчасці, гэтак жа адпрацавалі на зямлі доўгія гады, як іх суседзі. І маюць права на прыстойнае гандлёвае абслугоўванне. Чаму яны павінны быць задаволенымі бедным асартыментам, у той час, як іншыя вяскоўцы нават у межах аднаго раёна маюць паўнавартасную краму на колах? Пытанне, хутчэй за ўсё, рытарычнае.

Звычайна, калі гаворка заходзіць пра аўтакрамы, спецыялісты падкрэсліваюць іх сацыяльную функцыю. І гэта праўда. Нашы крамы на колах рэгулярна аб'язджаюць населеныя пункты, дзе застаецца пяць, тры, два, а то і адзін чалавек. Аўтар гэтых радкоў у апошнія гады пабывала ў шэрагу вёсак з адным апошнім жыхаром. І ўсе гэтыя людзі з удзячнасцю выказваліся пра аўтакраму, якая спыняецца непасрэдна каля дома. У такіх вёсках, вядома, няма альтэрнатывы падобнай форме абслугоўвання, хоць у фінансавым плане гэта работа па вызначэнні стратная.

### ПРАБЛЕМА КАДРАЎ

Але ж на згаданай мной сесіі дэпутаты заспелі аўтакраму, якая абслугоўвае два населеныя пункты з насельніцтвам 260 чалавек. Тут ужо проста мусіць быць стацыянарны гандлёвы пункт. Ён і ёсць, расказваў тады старшыня Брэсцкага райспажыўтаварыства Аляксей Бутыла. Але існуе праблема з прадаўцом. Цяжка знайсці чалавека на работу ў фактычна прыгарадных вёсках. Быў час, вазілі прадаўца з Брэста, потым пераводзілі з павільёна, які працуе ў дачным пасёлку, на зімовы час. Але такія часовыя меры не прывялі да поспеху. Людзі працавалі, мякка кажучы, без энтузіязму, адсюль і выручка на ўзроўні 4000 рублёў у месяц.

Цяпер гэта праблема для многіх сельскіх магазінаў, многія не могуць знайсці работніка. Відаць, вырашыць яе можна толькі больш прывабнымі ўмовамі, у ліку якіх на першым месцы стаіць заработная плата. А можа, трэба неяк глыбей вывучаць пытанне? У сельскай мясцовасці, здавалася б, не такі вялікі рынак працы, але чамусьці людзі не надта ахвотна ідуць працаваць прадаўцамі. Напрыклад, у Агародніках, суседніх з вёскай Коладна, пра якую гаварылася ў пачатку, прадаўца не было некалькі гадоў, крама стаяла закрытая. А цяпер адкрылі, людзям стала зручна. Праўда, у гэтым населеным пункце ёсць і прыватны магазін, які працуе, наколькі мне вядома, даволі паспяхова.

### ЗАКРЫЦЬ І ЗАБЫЦЬ?

А вось у тым самым Коладне з насельніцтвам крыху больш за паўсотні чалавек магазін закрылі два гады таму. І прадавец тут быў. Жанчына працавала па сумяшчальніцтве праз дзень, але людзі былі задаволеныя. Таму што ў краме было фактычна ўсё. Два халадзільнікі забяспечвалі асартыментны набор прадуктаў. Прамысловая група ўключала не толькі прывычныя гаспадарчыя тавары, нават элементарныя будаўнічыя заўсёды былі ў наяўнасці, а па заяўцы маглі прывезці што заўгодна. Калі праводзілі сельскі сход, на якім расказвалі пра перавагі аўтакрамы, абяцалі асартымент шырокі, свежасць прадуктаў і іншыя выгоды. Што маюць людзі цяпер, расказвалася ў самым пачатку. А памяшканне даволі дыхтоўнае, галоўнае — моцнае, стаіць зачыненае на замок і, як кожны пакінуты будынак, пачынае паціху разбурацца.

А колькі такіх памяшканняў у розных населеных пунктах!? Скажаце, няма ахвотных узяць іх, удыхнуць жыццё, наладзіць камерцыйны гандаль? Няма, таму што ўмовы, якія выстаўляюцца патэнцыяльнаму прадпрымальніку, патрабаванні ў нас надта ж высокія. Санітарныя, пажарныя, іншыя службы напішуць такі пералік, які небагатаму вяскоўцу адразу падасца непад'ёмным для рэалізацыі. Выходзіць, хай лепей гэтыя будынкі разбураюцца, хай ходзяць стратныя аўтакрамы, але пытанне выглядае закрытым, і ўсе павінны быць задаволеныя.

А што, калі рызыкнуць і паменшыць гэтыя патрабаванні? Некалі ж былі так званыя лаўкі дома, многія цяперашнія вяскоўцы іх памятаюць, і нічога, гандлявалі. Тады і хлеб прывозілі проста ў латках. Цяпер яго дастаткова ва ўпакоўцы, калі гаварыць пра санітарныя меркаванні. Не кажу, што варта паўтараць вопыт гандлю з жылога памяшкання, ды і наўрад ці знойдуцца цяпер такія ахвотнікі, а вось з гэтых старых магазінаў пры мінімальнай альбо і зусім нулявой арэндзе можна было б зрабіць гандлёвыя павільёны. І як бы ні агітавалі за аўтакрамы, перавагі стацыянарнага гандлю відавочныя. Пра гэта раскажа любая вясковая гаспадыня, дакажа на простым прыкладзе. Скажам, пачала варыць суп, а соль скончылася, пабегла ў магазін ды купіла. А тая, што забылася ўзяць пачак солі ў аўтакраме, машыну ўжо не дагоніць, давядзецца чакаць тры, а то і чатыры дні. Прынамсі, гараджаніну такія праблемы не вядомыя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

Дзеля памяці

# ПАХОДЫ МАГІЛЁЎСКІХ СУДЭКСПЕРТАЎ

**Боркі, Усакіна, Буйнічы — у Магілёўскай вобласці шмат мемарыяльных комплексаў, якія нагадваюць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Для супрацоўнікаў упраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці ўжо стала традыцыяй наведваць гэтыя мясціны і з прывязкай да іх вывучаць тую падзею, якая стала нагодай для стварэння на іх мемарыяла. Нядаўна яны здзейснілі гісторыка-патрыятычную экспедыцыю па Кіраўскім раёне, дзе фашысты правілі шэраг карніцкіх аперацый супраць мірнага насельніцтва. Свой паход прысвяцілі 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Удзельнікі экспедыцыі пабывалі на экскурсіі па мемарыяльным комплексе ў вёсцы Боркі, дзе 15 чэрвеня 1942 года адбылася адна з крывавых і жорсткіх трагедый у гісторыі чалавецтва. Нелюдзі з дывізіі нямецкага палача Оскара Дзірлевангера спалілі, расстралялі, закатавалі каля дзвюх тысяч жыхароў вёсак і пасёлкаў Закрынічча, Доўгае Поле, Хватаўка, Дзяржынскі, Пралетарскі, Чырвоны Араты.

— Мемарыяльны комплекс кожны раз уражвае да глыбіні душы, — кажа **афіцыйны прадстаўнік упраўлення ДКСЭ па Магілёўскай вобласці Ірына РАЧКОЎСКАЯ**. — Капліца, брацкая магіла, пліты з назвай населеных пунктаў Магілёўскай вобласці — сясцёр Хатыні, манумент «Беларусь — тужлівая маці», вуліца, на якой ад дамоў засталіся толькі часткі абвугленых сцен, кампазіцыя, дзе ў жудасным полымі гінуць людзі, студня з застылай чорнай вадой — усё гэта вяртае ў той чорны для беларусаў дзень і амаль фізічна прымушае перажыць страшную трагедыю.

Удзельнікі экспедыцыі наведалі таксама воінскія і грамадзянскія пахаванні ў Грыбаўцы і Збышыне гэтага ж раёна. На чале са сваім сцяганосцам яны прайшлі палявымі і ляснымі дарогамі 23 кіламетры. У воінскім пахаванні каля вёскі Грыбавец супакой знайшлі 31 чырвонаармеец і партызан. На абеліску пазначаны прозвішчы толькі 18 з іх, астатнія — невядомыя. У агульнай магіле ў вёсцы Збышын ляжыць 286 чалавек з ліку чырвонаармейцаў і мясцовых жыхароў, з якіх 169 — невядомыя.

Судэксперты ўшанавалі памяць загінулых хвілінай маўчання і ўсклалі кветкі да помнікаў і абеліскаў. Дарэчы, гісторыка-патрыятычная экспедыцыя па месцах значных падзей Вялікай Айчыннай вайны стала трэцяй на рахунку супрацоўнікаў упраўлення ДКСЭ па Магілёўскай вобласці.

— Вельмі важна асабіста паприсутнічаць на гэтых мемарыялах, — падкрэсліў **начальнік упраўлення ДКСЭ па Магілёўскай вобласці Яраслаў ФЕДАРЫНЧЫК**. — Гэта захаванне гістарычнай памяці і праўды пра лёс беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Каб захаваць незалежнасць нашай краіны і чыстае неба, неабходна ведаць і памятаць страшныя ўрокі мінулага, працягваць карпатлівую працу па ўвекавечанні памяці ўсіх загінулых.


Фота з архіва ўпраўлення ДКСЭ па Магілёўскай вобласці

Аб паходзе ў Кіраўскі раён яго наведвальнікам сёння нагадваюць шматлікія фота. Удзельнікі перакананы, што менавіта ў такіх месцах вострa адчуваюцца наступствы вайны. Іх трэба паказваць дзецям, каб і яны змаглі прасякнуцца ваеннай гісторыяй, пачуць у пранізлівай цішыні той жалобны стогн ахвяр фашызму і перачытаць хвалюючыя да глыбіні душы словы, як на абеліску ў Борках: «Люди! ...мы так не хотели умирать! Помните о нас. Сделайте все, что мы не успели, и на столетия вперед расскажите всем: нет ничего страшнее войны. Забвение может повторить трагедию!»

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ТРАПІЧНЫЯ НОЧЫ, УРАГАНЫ З ЛІЎНЯМІ І ТЭМПЕРАТУРА ПАД 40

## ДА 70 ГАРАЧЫХ ДЗЁН ЗА СЕЗОН

Па адхіленні сярэдняй тэмпературы паветра за летні сезон ад кліматычнай нормы па тэрыторыі нашай краіны мы знаходзіліся ў ружовай і чырвонай станоўчай зоне.

У абласным разрэзе найбольшыя значэнні станоўчых анамалій тэмпературы паветра адзначаны ў Магілёўскай вобласці (плюс 2,2 градуса). У Віцебскай, Мінскай і Брэсцкай абласцях адхіленні былі найменшымі (плюс 1,8 градуса).



Адхіленне (°C) сярэдняй тэмпературы паветра летняга сезона ад кліматычнай нормы па тэрыторыі Беларусі.

Спецыяліст адзначыла, што за мінулае лета адзначана ад 39 да 70 гарачых дзён (з тэмпературай 25 градусаў і вышэй) пры норме 29—59 дзён і ад 2 да 28 вельмі гарачых дзён (з тэмпературай 30 градусаў і вышэй) пры норме ад аднаго да 13 дзён.

Максімальнага значэння за летні сезон тэмпература паветра дасягнула 13 ліпеня на станцыі Жыткавічы і склала 37,9 градуса спёкі. Мінімальны паказчык паветра быў адзначаны на станцыі Палеская 14 жніўня і склаў 4,7 градуса. Сярэдняя тэмпература ўсіх летніх месяцаў была вышэйшая за норму.

Як перадаюць кліматолагі, сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за чэрвень 2024 года склала 18,9 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 1,9 градуса. Чэрвень бягучага года заняў 8-е месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага цёплага да самага халоднага, пачынаючы з 1945 года. Сярэдняя тэмпература паветра ўсіх трох дэкад вышэйшая за норму. Вельмі цёплай выдалася трэцяя дэкада са станоўчай анамаліяй 3,6 градуса.

А вось з 25 чэрвеня да 1 ліпеня адзначана хваля цяпла па ўсёй тэрыторыі краіны. У канцы месяца максімальнага значэння (33,5 градуса) тэмпература паветра дасягнула 30 чэрвеня на станцыі Жыткавічы. Мінімальная тэмпература паветра — на станцыі Бярэзінскі запаведнік 9 чэрвеня: 4,8 градуса.

У нашай краіне **самым цёплым месяцам лічыцца другі месяц лета**. У гэтым сезоне адзначаецца і самая вялікая яго станоўчая анамалія. Сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за ліпень 2024 года склала 21 градус, што вышэй за кліматычную норму на 2,1 градуса. Ліпень бягучага года заняў 8-е месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага цёплага да самага халоднага, пачынаючы з 1881 года.

Сярэдняя тэмпература паветра першых дзвюх дэкад была вышэйшая за норму, трэцяя дэкада па тэмпературным рэжыме — блізкая да нормы. Вельмі цёплай выдалася другая дэкада з самай станоўчай анамаліяй 4,2 градуса.

У ліпені была адзначана інтэнсіўная хваля цяпла з 7 да 27 чысла, у паўночных і цэнтральных раёнах краіны хваля цяпла распалася на дзве часткі. У асобныя суткі месцамі па краіне зарэгістраваны трапічныя ночы (мінімальная тэмпература паветра за ноч складала 20 цяпла і больш).

Максімальнага значэння (37,9 градуса) тэмпература паветра дасягнула 13 ліпеня на станцыі Жыткавічы. У ліпені 2024 года на шэрагу станцый абноўлены значэнні абсалютнага максімуму тэмпературы паветра, перавысіўшы папярэднія на 0,1—2,4 градуса. Мінімальная тэмпература паветра адзначана на станцыі Палеская 6 ліпеня і склала 6,6 градуса.

Здзіўляў нас рэзкімі хвалямі цяпла і **халаднаваты апошні месяц лета**. Сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра за жнівень 2024 года склала 19,9 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 1,9 градуса. Жнівень бягучага года заняў 5-е месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад самага цёплага да самага халоднага, пачынаючы з 1945 года.

Сярэдняя тэмпература паветра першай дэкады жніўня была некалькі ніжэйшай за норму (0,8 градуса). Тэмпература другой дэкады была вышэйшай за норму на 1,6 градуса. Але затое вельмі цёплай зафіксавана трэцяя дэкада са станоўчай анамаліяй, роўнай 4,7 градуса.

Максімальная тэмпература паветра месяца — 35,1 градуса — адзначана днём 19 жніўня на станцыі Кастрычнік і 21 жніўня на станцыі Лельчыцы. Мінімальная тэмпература паветра — на станцыі Палеская 14 жніўня: 4,7 градуса.

У другой палове месяца — з 15 да 31 жніўня назіралася чарговая хваля цяпла. У асобныя суткі ў другой і трэцяй дэкадах месцамі па краіне зарэгістраваны трапічныя ночы (гэта калі ноччу больш чым 20 градусаў).

## У ПЕРШЫЯ ДВА МЕСЯЦЫ ЗАЛІВАЛА, А ПАСЛЯ ЗАСУШЫЛА

За летні сезон у сярэднім па Беларусі выпала 233 міліметры ападкаў, што складае 103 % кліматычнай нормы. Па тэрыторыі краіны ўмовы ўвільгатнення былі неаднастайныя. Па большай частцы тэрыторыі выпала 75—125 % сезоннай нормы ападкаў.

У абласным разрэзе найбольшая за сезон колькасць ападкаў выпала ў Віцебскай вобласці — 260 міліметраў, або 111 % кліматычнай нормы. Найменшая колькасць ападкаў выпала ў Гомельскай вобласці — 198 міліметраў, або 88 % кліматычнай нормы.

На працягу сезона ападкі выпадалі нераўнамерна. У чэрвені і ліпені назіраўся лішак ападкаў: выпала 116 % і 123 % ад кліматычнай нормы адпаведна. У жніўні назіраўся недабор ападкаў (выпала каля 62 % ад нормы).



Адхіленне (%) сумы ападкаў за летні сезон ад кліматычнай нормы па тэрыторыі Беларусі.

За чэрвень у сярэднім па краіне выпала 83 міліметры ападкаў, што склала 116 % кліматычнай нормы. Па тэрыторыі краіны ападкі распаўсюджваліся нераўнамерна. Па большай частцы тэрыторыі краіны выпала ад 100 % да 200 % нормы ападкаў. На станцыі Брагін абноўлены гістарычны месячны і сутачны максімум сумы ападкаў.

За ліпень у сярэднім па краіне выпала 110 міліметраў ападкаў, што склала 123 % ад кліматычнай нормы. Па тэрыторыі краіны ападкі распаўсюджваліся нераўнамерна. Па большай частцы краіны назіраўся лішак ападкаў. Адзначалася павелічэнне аб'ёму ападкаў з паўднёвага ўсходу на паўночны захад ад 50—80 % да 200—220 % кліматычнай нормы адпаведна.

За жнівень у сярэднім па краіне выпала 39 міліметраў ападкаў, што склала 62 % ад кліматычнай нормы. Па ўсёй тэрыторыі краіны, за выключэннем асобных пунктаў назірання Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей, адзначаўся недабор ападкаў: выпала ад 40 да 80 % нормы. На станцыі Васілевічы абноўлены абсалютны мінімум месячнай колькасці ападкаў (5 міліметраў).

У жніўні на рэках краіны адзначаліся ваганні ўзроўню вады. Вада знаходзілася на пойме на Віліі каля аграгарадка Сцешыцы, прытоку Нёмана рацэ Рось і прытоку Бярэзіны рацэ Бобр. Неспрыяльныя ўмовы для рачнога транспарту назіраліся на суднаходных участках Заходняй Дзвіны, Нёмана, Дняпра, Бярэзіны і Сожа. На рацэ Цне (прыток Прыпяці) каля вёскі Дзятлавічы значэнне ўзроўню вады апусцілася ніжэй за шматгадовы мінімальны ўзровень за перыяд летне-восеньскай межані, а на рацэ Убарці (прыток Прыпяці) каля вёскі Краснабярэжжа ўзровень вады наблізіўся да шматгадовага мінімуму.

Воднасць Заходняй Дзвіны і Прыпяці была меншая за норму на 30—45 %, Нёмана, Віліі, Дняпра і Бярэзіны — блізкая да звычайнай для гэтай пары года і крыху меншая за яе, а воднасць Сожа — крыху большая за норму.

## ПАРЫВЫ ВЕТРУ ДАСЯГАЛІ 29 МЕТРАЎ ЗА СЕКУНДУ

На працягу летняга сезона па краіне назіраліся туманы і навальніцы. Таксама адзначалася выпадзенне граду, якое месцамі дасягала крытэрыяў небяспечнай метэаралагічнай з'явы, калі дыяметр градзін дасягаў 20 міліметраў і больш.

«Так, 14 чэрвеня на гідралагічным пасту Лапаціна ў Пінскім раёне быў зафіксаваны град дыяметрам 25 міліметраў. Дажджы ў асноўным насілі ліўневы характар, месцамі дасягаючы крытэрыяў небяспечнай з'явы. Так, 20 жніўня (літаральна за пару гадзін) на гідралагічным пасту Беліца ў Лідскім раёне выпала 95,7 міліметра ападкаў. А 18 ліпеня ў Мінску выпала рэкордная сутачная колькасць ападкаў — 88 міліметраў. Папярэдні рэкорд фіксаваўся ў жніўні 2005 года і склаў 77,5 мілімера», — распавяла Таццяна Гіль.

Улетку спецыялісты фіксавалі вецер парывамі да 15 м/с і больш. Месцамі вецер дасягаў небяспечных метэаралагічных з'яў, з парывамі 25 м/с і больш. «Максімальная хуткасць ветру за летні сезон была адзначана на станцыях Гомель 14 чэрвеня і Касцюковічы 18 ліпеня, склаўшы 29 м/с», — падкрэсліла метэаролаг.

Асобна спецыяліст спынілася на ўраганах, якія назіраліся гэтым летам. Па сутнасці, смерч — парыў халоднага паветра з высокіх слаёў на вельмі цёплую падсцілальную паверхню. І чым яна цяплейшая, тым верагоднасць узнікнення смерчу вышэйшая. У апошнія гады часцей адбываецца дысбаланс велічынь выпарэння і ападкаў.

Так адбываецца, што далей насычанае вільгаццю паветра з паверхні падымаецца ўверх і кандэнсуецца, вызваляючы дадатковую энергію. Ціск унутры віхуры змяняецца з такой хуткасцю, што не паспявае выраўнавацца з ціскам каля паверхні».

Спрагназаваць гэту прыродную з'яву вельмі цяжка, лічыць спецыяліст. Смерч мае памеры ад некалькіх метраў да сотняў метраў і праходзіць вузкай паласой, так што непасрэдна на метэастанцыі значнага ўзмацнення ветру можа і не быць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Надвор'е

# ДАЖДЖЫ ПРЫЙДУЦЬ, АЛЕ ЦЕПЛЫНЮ НЕ ПАГАСЯЦЬ

**На гэтым тыдні антыцыклон «Квенцін» аслабіць свае пазіцыі, а да заходніх межаў наблізяцца атмасферныя франты. У выніку ў аўторак па захадзе, а ў астатнія дні ў асобных раёнах краіны сонечнае надвор'е перыядычна будуць парушаць масівы кучава-дажджавой воблачнасці, якія нясуць лакальныя навальнічныя дажджы.**

Як адзначаюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, няглядзячы на кароткачасовыя дажджы, у краіне будзе назірацца анамальна цёплае надвор'е.

У аўторак надвор'е ў краіне ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі раніцай і днём на захадзе краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу. Ноччу невялікая воблачнасць, днём воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём па захадзе кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Вецер паўднёва-ўсходні, паўднёвы ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 5 да 11 цяпла, у асобных раёнах 12—16 градусаў. Днём будзе значна цяплей, ад 22 да 28 градусаў, а па захадзе Беларусі яна складзе 18—21 цяпла. Атмасферны ціск будзе падаць.

У сераду і ў чацвер тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца ў асноўным у зоне дзеяння малярухомага атмасфернага фронту. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. 11 верасня месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер ноччу няўстойлівы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 10 градусаў да 15, максімальная днём — 20—25 градусаў, па паўднёвым усходзе краіны да 28 цяпла.

У чацвер месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер ноччу няўстойлівы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы падымецца і складзе 11—17 цяпла, а днём усталюецца ў межах 21—28 градусаў.

Як удакладнілі ў Белгідрамеце, гэтымі днямі ў Беларусі захаваецца павышаны тэмпературны фон у асноўным на 4—8 градусаў вышэй за сярэднія шматгадовыя значэнні. Разам з тым у выніку доўгага перыяду сухога і гарачага надвор'я на большай частцы тэрыторыі краіны ўсё яшчэ захоўваецца высокі клас пажарнай небяспекі, а па паўднёвым усходзе — надзвычайная пажарная небяспека. Тут дзейнічае чырвоны ўзровень небяспекі.

У пятніцу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Як і ў папярэднія дні, слабы туман апусціцца ў асобных раёнах краіны ноччу і раніцай. Ад 12 да 18 градусаў цяпла ноччу, 20—26 градусаў чакаецца днём. Па паўднёвым усходзе тэмпература паветра падымецца да 28 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НА СТАРТ! УВАГА! ПАБЕГЛІ!

## Якімі вынікамі сёлета ўразіў знакаміты паўмарафон

**У нядзелю, 8 верасня, беларуская сталіца правяла адну з самых масавых і відовішчных падзей спартыўнага года — Мінскі паўмарафон. Лёгкаатлетычны забег, які па праве можна лічыць візіткай краіны, па словах арганізатараў, гэтым разам сабраў не менш за 20 тысяч удзельнікаў з 11 краін, у тым ліку з Беларусі, Расіі, Украіны і нават Егіпта. Аматары бегу выйшлі на старт наступных дыстанцый: 10,5 кіламетра, 21,097 кіламетра і самай масавай — 5 кіламетраў. Таксама ўпершыню прайшла карпаратыўная эстафета. А завяршыў праграму Мінскага паўмарафону сямейны забег, у якім узялі ўдзел самыя юныя лёгкаатлеты і іх бацькі.**




Адлік гісторыі Мінскага паўмарафону часцей за ўсё вядуць з 2015 года. Аднак за два гады да гэтага (з 2013-га) праходзілі аналагічныя гонкі для аматараў і прафесіяналаў са стартам каля Палаца спорту. Удзельнікаў было не так шмат, але жыхары і госці сталіцы з іншых краін прыязджалі такім чынам адзначыць Дзень горада. Ужо тады сярод бегуноў з'яўляліся медыйныя асобы, якія любяць кідаць сабе выклік.

Аб арганізацыі паўмарафону ў 2015 годзе варта сказаць асобна. За некалькі месяцаў да старту турнір звярнуў на сябе ўвагу тысяч людзей. Для ўсіх ахвотных праводзілі бясплатныя трэніроўкі, вялі іх спецыялісты па бегавых дысцыплінах. Пазней яны распавядалі мноства гісторый пра тое, як прыходзілі людзі «з нуля» і да спаборніцтваў аказваліся гатовыя прабегчы 5-10 кіламетраў, а самыя мэтанакіраваныя — дыстанцыю паўмарафону (21 кіламетр).

З 2015-га арганізатары прапаноўвалі бегунам выходзіць на старт у незвычайных касцюмах. І ўдзельнікі здзіўлялі фантазіяй: яны пераўвасабляліся ў супергерояў з фільмаў, папулярных мультыплікацыйных персанажаў, спевакоў. Некаторыя бегалі нават з хатнімі гадаванцамі. Пасля фінішу аднаго з турніраў хлопец зрабіў дзяўчыне прапанову і пачуў у адказ «Так». Праз год, напярэдадні паўмарафону, у іх адбыўся шлюб, а затым новая сям'я пераадолела 21 кіламетр, прычым нявеста — у вясельнай сукенцы.






Сёлета першыя тысячы аматараў бегу выйшлі на дзесяцікіламетровую дыстанцыю. Стартавалі з вуліцы Кірава, а фінішам стала лёгкаатлетычнае ядро Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама». Ужо ў 9 раніцы радасныя, поўныя бадзёрасці і сіл удзельнікі абудзілі вуліцу Кірава сваёй энергіяй — цэлымі сем'ямі, разам з сябрамі і калегамі адкрылі доўгачаканую падзею. Дарэчы, для многіх бегуноў Мінскі паўмарафон — не толькі пра мэты і дасягненні, а ў першую чаргу яшчэ і задавальненне.

Гэтым разам традыцыйны міжнародны паўмарафон сабраў больш за 20 тысяч аматараў бегу з 11 краін. Пераможцамі 10-кіламетровага забегу сталі Мікіта Коценеў і Таццяна Шабанава.

Далей на старт выйшлі ўдзельнікі самай доўгай і прэстыжнай дыстанцыі — 21,1 кіламетра. У мужчын найлепшы вынік сярод 1700 бегуноў паказаў наймацнейшы беларускі марафонец Уладзіслаў Прамоў (1 гадзіна 6 хвілін 49 секунд). Год таму Прамоў быў другім, саступіўшы расіяніну Рынасу Ахмадзееву. Другім фінішаваў Сяргей Карпаў — ён саступіў лідару 45 секунд. Тройку прызёраў замкнуў Мікіта Чахоўскі з вынікам у 1 гадзіну 7 хвілін 45 секунд. Прабегчыся ў адной калоне з тытулаванымі беларускімі марафонцамі былі рады многія ўдзельнікі.

У жанчын поспех святкавала тытулаваная беларуская бягуння на доўгія дыстанцыі Марына Даманцэвіч, гэтая перамога на Мінскім паўмарафоне стала для яе трэцяй запар. Даманцэвіч прабегла дыстанцыю за 1 гадзіну 13 хвілін і 58 секунд, пабіўшы ўласны рэкорд трасы. Другое месца заняла Вольга Немагай — 1 гадзіна 14 хвілін 30 секунд, трэцяй фінішавала Ганна Максімава — 1 гадзіна 16 хвілін 45 секунд.

Дарэчы, у скверы на тэрыторыі стадыёна «Дынама» была разгорнута пляцоўка Прэзідэнцкага спартыўнага клуба «Спорт для ўсіх», на якой працавалі лакацыі: футбольны фрыстайл, зумба, пілатэс, трэніроўка з трэнерам на воркаўт-пляцоўцы. Кульмінацыяй стаў розыгрыш дзесяці веласіпедаў сярод усіх, хто прыйшоў у гэты дзень на пляцоўку.



У кожнага з удзельнікаў Мінскага паўмарафону былі свае мэты. Хтосьці хацеў праверыць сябе і пераадолець выбраную дыстанцыю без прыпынкаў, хтосьці нацэльваўся на канкрэтны вынік. Для студэнтаў, выкладчыкаў і кіраўнікоў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка ўдзел у самым масавым забегу на пяць кіламетраў стаў ужо добрай традыцыяй. На старт яны выйшлі пад дэвізамі: «Будучыя педагогі — за здаровы лад жыцця!», «Праз спорт — да здароўя!», «Да новых перамог разам!». У юбілейны для ВНУ год у лёгкаатлетычным свяце ўзялі ўдзел 1110 чалавек.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**







Наканавана лёсам

# ШЭСЦЬДЗЯСЯТ ГАДОЎ СЛУЖЭННЯ НАВУЦЫ

**У свой першы працоўны дзень яна заблудзіла ў Батанічным садзе — пра гэта ўспамінае з цёплай усмешкай. Вось ужо 60 гадоў доктар біялагічных навук, галоўны навуковы супрацоўнік Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі Нэлі Уладзіміраўна ГЕТКО штодня прыходзіць сюды, дзе прыгажосць спалучаецца з сур'ёзнымі даследаваннямі на карысць грамадству.**



## Дзіця вайны

— Я нарадзілася ў Мінску ў 1938 годзе. Бацька працаваў машыністам, вадзіў саставы ў Польшчу, Германію. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ён якраз быў у паездцы. Маці са мной і братам пад бамбёжкамі сыходзілі па Маскоўскай шашы на ўсход. Ішлі лясамі і праз месяц пешшу дабраліся да Смаленска. Там мама звярнулася ў мясцовае дэпо і даведалася, што Мінскае дэпо эвакуіравана ў Бугульму. А бацьку паведамілі, што мы жывыя і шукаем яго. Са Смаленска вайскоўцы дапамаглі нам дабрацца да Вязьмы, потым наш шлях ляжаў у Маскву, адкуль эвакуіраваліся ў Бугульму. Праз год бацька быў мабілізаваны, загінуў у бітве пад Сталінградам. Мы вярнуліся ў Мінск у 1944 годзе пасля яго вызвалення. Маці расказвала, што, калі яна сышла з цягніка, з платформы быў бачны Оперны тэатр — настолькі вялікія былі разбурэнні, дамы ляжалі ў руінах, — успамінае сваё нялёгкае дзяцінства мая гераіня.

Пра кар'еру вучонага Нэлі Уладзіміраўна не марыла. Спачатку хацела стаць доктарам, затым — настаўніцай. Апошнюю мару здзейсніць атрымалася.

— Сябар нашай сям'і працаваў прарэктарам універсітэта, быў па спецыяльнасці геолагам. Ён і параіў паступаць на біяфак. Гэта было няпроста, конкурс — шэсць чалавек на месца, але мне ўдалося. Пасля заканчэння біялагічнага факультэта БДУ тры гады была настаўніцай хіміі і біялогіі ў вясковай школе. Педагагічная праца, дзеці навучылі мяне важным навыкам камунікацыі.

## «Стаю сярод лесу і ледзь не плачу»

Хімія заўсёды давалася Нэлі Уладзіміраўне лёгка. Пэўны час яна працавала малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута фізіка-арганічнай хіміі АН БССР. Менавіта калегі з Інстытута ўгаварылі яе пагадзіцца на аспірантуру ў Батанічным садзе.

— «Я ж батаніку цярпець не магу!» — адказала я. Аднак пасля знаёмства з дырэктарам Батанічнага саду акадэмікам Мікалаем Уладзіслававічам Смольскім памяняла сваё меркаванне. Ён аказаўся вельмі прыемным, добрым чалавекам. Стаў для мяне як родны бацька.

У Батанічны сад Нэлі Уладзіміраўна прыйшла шэсцьдзясят гадоў таму: у 1964-м. І сёння, калі яна расказвае пра сваю працу, у жанчыны гарэць вочы. Свой першы працоўны дзень успамінае з цёплай усмешкай.

— Вырашыла пазнаёміцца з Батанічным садам, бо там жа расліны са ўсяго свету! Хаджу, вывучаю этыкеткі: тут хвойныя, тут ліпы, дубы... Праз некаторы час разумею, што заблудзіла. Стаю сярод лесу ў белым халаце і ледзь не плачу. Адзін з супрацоўнікаў, як потым аказалася, дэндролаг, кандыдат навук, ішоў з лінейкай аглядаць глог і вывеў мяне да людзей.

## Навуковае жыццё

Праца ў Батанічным садзе адразу захапіла маладую аспірантку. Яна адчула, што на сваім месцы. І гэтае пачуццё ніколі ўжо не пакідала Нэлі Уладзіміраўну, хоць лёгкіх шляхоў у навуцы не бывае.

— У той час у Беларусі пачалі актыўна стварацца галіны хімічнай прамысловасці. Будаваўся нафтаперапрацоўчы завод у Наваполацку. Нам была пастаўлена канкрэтная задача: ахова навакольнага асяроддзя. Як расліны дапамагаюць справіцца з забруджваннем паветра? Якім чынам самі прыстасоўваюцца да такіх умоў? І што мы можам прапанаваць нашым гарадам для азелянення? Гэтыя тэмы і сталі маёй працай.

Пачаўся самы складаны этап у навуковым даследаванні — эксперыментальны. У спецыяльных камерах, якія наўмысна задымляліся, вырошчвалі розныя расліны для наступнага вывучэння. Раней у Беларусі нават не існавала такога кірунку ў навуцы, таму Нэлі Уладзіміраўна ездзіла ў камандзіроўкі па розных гарадах СССР: Уфа, Перм, Данецк.

Усе даследаванні прымяняліся на практыцы на заводах. Дзе б мы ні ўкаранялі свае распрацоўкі, нас заўсёды сустракалі зацікаўлена. У Наваполацку на нафтаперапрацоўчым заводзе «Нафтан», на ААТ «СветлагорскХімвалакно» і па сёння захаваліся нашы пасадкі. Хвойныя расліны аказаліся вельмі ўстойлівымі да забруджвання. Цяпер там растуць піхты, туі, ядлоўцы, блакітныя елі. І клёны. Ёсць невялікія пасадкі рададэндранаў, руж, глогу.

## Аранжарэі адагравалі вугаллем

Самымі цяжкім часамі для Батанічнага саду сталі 90-я гады. Нэлі Уладзіміраўна ўспамінае іх з горыччу. Не хапала сродкаў, каб нават аплаціць ацяпленне.

— Мы жылі ў бядоце. Супрацоўнікі атрымлівалі па 0,5 стаўкі, а можа і яшчэ менш. Трубы былі старыя, пастаянна здараліся аварыі. Сядзелі ў ватніках і ботах, каб не змерзнуць. Але самае страшнае — нашы калекцыі! Мы разносілі вёдры з распаленым вуглем і расстаўлялі ў аранжарэях. Здаралася, трэскалася шкло, і снег падаў прама на расліны.

З прыходам на пасаду дырэктара Уладзіміра Рашэтнікава Батанічнаму саду дапамаглі спецыялісты з Інстытута ядзернай энергетыкі: усталявалі інфрачырвоныя выпраменьвальнікі. Так удалося выратаваць калекцыі.

— Расліны ў Батанічным садзе ў Данецку тады пазамярзалі, і яго загадчыца амаль кожную вясну прыязджала да нас. Мы дзяліліся з ёю насеннем, давалі тое, што нам удалося выратаваць, — успамінае навукоўца.

## Любімыя кветкі — ружы

Нэлі Уладзіміраўна — аўтар 182 навуковых прац. Нядаўна здала чарговую манаграфію. Біёлаг выхавала не адно пакаленне кадраў: чатырох кандыдатаў навук, нямала аспірантаў, саіскальнікаў навуковых званняў.

— Галоўнае — ведаць, што твая праца неабходная людзям. А для душэўнага камфорту важна быць сярод аднадумцаў, на якіх можаш спадзявацца, — дзеліцца сакрэтам паспяховага прафесійнага шляху гераіня.

Не магла не запытацца ў Нэлі Уладзіміраўны пра яе любімую расліну.

— Ружы, — адказала яна адразу. — Магу доўга стаяць і глядзець на букет гэтых кветак. Між іншым, у Чэхаславакіі нашы ружы атрымлівалі залатыя медалі за якасць! Пасля поўнай нястачы 90-х нам удалося захаваць аўтарскія гібрыды нашага выдатнага кветкавода Любові Гусаравай, якія растуць у адкрытым грунце.

**Юлія РАМАНЬКОВА,**
**фота аўтара.**




Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5. УНП 700067572 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Помещение столовой**

(710/D-68145, 2205,2 кв. м, составные части: мощение).
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 3-3**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 949 200,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.10.2024 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 10.10.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов
и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by,
местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **коммунального унитарного предприятия «Миноблавтосервис»**
(продавец, местонахождение: г. Минск, ул. П. Бровки, 27),
проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1:** автобус вагон ГОЛАЗ-52911,
2004 г. в., рег. знак № 1056 АН-5, цвет: белый,
кузов (рама) № VS2K4X20001848408.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 11 280,00 бел. руб.**
Задаток от начальной цены 10 % – 1 128,00 бел. руб.

**Лот № 2**: автомобиль легковой TOYOTA LAND-CRUISER 120,
2008 г. в., рег. знак № 1015 АН-5, цвет: черный,
кузов (рама) № JTEBU29J005144716.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 38 524,93 бел. руб.**
Задаток от начальной цены 10 % – 3 852,00 бел. руб.
Стоимость снижена на 40 %.

**Автомобили расположены по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 27.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by
Электронные торги состоятся **24.09.2024** в **10.00** на torgi.rlt.by
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2024** до **17.00.**

**Тел. организатора торгов (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: +375297002211.**
Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by

УНП 100802202

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**
**«БелЮрОбеспечение»** (192821149)
**назначено проведение электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| **Организатор** | Филиал № 5 «Гродненский КСМ» ОАО «Красносельскстройматериалы» |
| **Предмет** | Лот № 9.2024.09.00027 клуб-столовая площадью 2328,1 кв. м |
| **Место нахождения** | г. Гродно, ул. Санаторная, 5Б |
| **Начальная стоимость** | 521 171,00 белорусских рублей с НДС |

Торги будут проведены **26.09.2024 с 9.00 до 18.00**
на **ЭТП e-auction.by.**
*Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 25.09.2024.*
*Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».*

# УРАЖАННІ І АДКРЫЦЦІ



## На Чырвонапрэсненскай набярэжнай, 14 у сталіцы Расійскай Федэрацыі з 4 да 8 верасня прайшоў 37-ы Маскоўскі міжнародны кніжны кірмаш

**Падзея ўражлівая, яе ў значнай ступені можна лічыць своеасаблівай штогадовай заканадаўчай пляцоўкай для развіцця кніжнай справы на ўсёй постсавецкай прасторы. Менавіта тут калегам-выдаўцам, бібліятэкарам, кнігагандлярам прадстаўляецца большасць кніг, якія выдаюцца на працягу мінулага года, тут праходзяць важныя перагаворы, канферэнцыі, круглыя сталы, тут абмяркоўваюцца ў розных фарматах тэндэнцыі развіцця кніжнага рынку ў Расіі і ў суседніх краінах, ды і ва ўсім свеце таксама. Гэтымі ж днямі на адной пляцоўцы з традыцыйным кніжным кірмашом праходзіў і II Маскоўскі міжнародны дзіцячы кніжны кірмаш. Уваход на абедзве прадстаўнічыя падзеі быў вольны, што даволі важна для наведвальнікаў. Дарэчы, у Беларусі практыка вольнага ўваходу на кніжныя выстаўкі і кірмашы існуе пастаянна... Па традыцыі ў кніжным свяце ў Расіі ўдзельнічала і дэлегацыя Рэспублікі Беларусь, сфарміраваная пад кіраўніцтвам Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. У складзе дэлегацыі — і кнігагандляры, і выдаўцы...**

### БЕЛАРУСКІ СТЭНД

На стэндзе «Кнігі Беларусі» было размешчана некалькі соцень навінак нашых айчынных выдавецтваў — прадукцыя выдавецтваў «Мастацкая літаратура», «Беларусь», Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Беларуская навука», БелТА, выдавецтва «Адукацыя і выхаванне». Расказвае галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Вольга Рацэвіч, якая прадстаўляла выдавецтва «Мастацкая літаратура»:

— Разам з іншымі выданнямі мы прывезлі на кірмаш шмат класічнай літаратуры — паэтычныя і празаічныя кнігі добра вядомых класікаў беларускай літаратуры, зборнікі Якуба Коласа, Янкі Купалы, Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Вячаслава Адамчыка... Як на беларускай, так і на рускай мове. Кіраваліся пры гэтым спадзяваннямі, што на кірмаш да беларускага стэнда зазірнуць нашы суайчыннікі альбо нашчадкі беларусаў, якія жывуць у Маскве, Падмаскоўі, якія гатовы прыехаць з блізкіх да Масквы гарадоў. І прыемна, што такія сустрэчы на кірмашы адбываліся. Яны яшчэ і тым цікавыя, што мы пачулі запыты на заўтра. І, безумоўна, гэтыя падказкі ўлічым пры планаванні нашай работы на будучы год.

Найболей запатрабаванымі на стэндзе «Кнігі Беларусі» былі краіназнаўчыя выданні — рознага характару альбомы, даведачныя выданні, энцыклапедыі. Госці набывалі філакартычныя альбомы Уладзіміра Ліхадзедава, звярталіся да кніг, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Распытвалі, папярэдне, віцька, займеўшы некаторую інфармацыю праз сацыяльныя сеткі, і пра даследаванні доктара біялагічных навук Анатоля Федарука, які на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў плённа вывучаў і апісваў старадаўнія сядзібы розных куточкаў Беларусі. Звярталі наведвальнікі ўвагу і на кніжную серыю «Сучасная беларуская літаратура», праектаваннем і выданнем якой займаюцца вядомае беларускае адукацыйнае выдавецтва «Аверсэў» і Саюз пісьменнікаў Беларусі.

### «МАСТАЦТВА КНІГІ» ДЗЯРЖАЎ — УДЗЕЛЬНІЦ СНД: БЕЛАРУСЬ ЛІДЗІРУЕ

Таксама па даўняй традыцыі ў час Маскоўскага кніжнага кірмашу падводзяцца вынікі аўтарытэтнага на ўсёй постсавецкай прасторы конкурсу на найлепшае кніжнае выданне. Сёлета ў гэтым творчым праекце спаборнічалі выдавецтвы шасці краін — Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана. У беларусаў — наступныя перамогі. Першае месца ў намінацыі «Садружнасць» заняла кніга палітолага Сяргея Мусіенкі і публіцыста Максіма Осіпава «Привкус цветных революций», якая пабачыла свет у выдавецтве «Беларусь». Другое месца ў намінацыі «Мая краіна» — у фотаальбома В. Шышанава і А. Пушнякова «Віцебск. 1050» (выдавец — БелТА). У спаборніцтве «Дыялог культур» першае месца — за кнігай «Казкі народаў Беларусі» (у выдавецтве «Беларусь» іх уклаў Аляксандр Сачанка; кніга выйшла ў серыі «Вялікая энцыклапедыя маленькага прафесара»).

Выдавецтва «Беларусь» атрымала перамогу і ў намінацыі «Кніга для дзяцей і юнацтва» — за кнігу «Школа юнага алімпійца: дзецям пра спорт». Выданне ўбачыла свет у серыі «Беларуская дзіцячая энцыклапедыя». Дыпломам трэцяй ступені гэтае ж выдавецтва ў раздзеле «Навука і адукацыя» адзначана за кнігу С. Шмарлоўскага і В. Давідовіч «Выбары ў Беларусі. Коратка пра галоўнае». Сярод вылучаных на «Арт-кнігу» другое месца — у кнігі публіцыстікі, загадчыка аддзела культуры Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Ірыны Аўсяп'ян «Ведаем, ганарымся! Вядомыя людзі Беларусі» (яе цудоўна аформіў кніжны графік, карыкатурыст Алег Карповіч). Кніга ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». У намінацыі «Мастацтва ілюстрацыі» дыпломам другой ступені атрымала выданне выдавецтва «Беларусь» за кнігу «Тайна магического кристалла».

У раздзеле «Аддрукавана ў Садружнасці» першае месца — у кнігі мінскага выдавецтва «Форум» «Ад Масквы да Брэста». Намінацыя «Перамога» прынесла першае месца філакартычнаму альбому беларускага калекцыянера лаўрэата Прэміі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў галіне культуры і мастацтва, лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава «Беларусь непераможная». І самая галоўная намінацыя — «Гран-пры». Спецыяльны дыплом атрымала кніга публіцыста Алега Усачова «Партызаны Беларусі» (выдавецтва «Беларусь»).

Спецыяльным дыпломам конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД адзначана кніга журналісткі Валеры Сцяцко «Творец своей судьбы. Алексей Талай» (Выдавецкі дом «Звязда»).

— Беларускія здабыткі ў кнігавыданні не могуць не радаваць, больш за тое — нават не могуць не ўражваць, — каментуе вынікі конкурсу «Мастацтва кнігі краін СНД» рэферэнт упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Вікторыя Лукашуте. — Высокае журы, эксперты Міждзяржаўнага савета па супрацоўніцтве ў галіне перыядычнага друку, кнігавыдання і паліграфіі дзяржаў — удзельніц СНД традыцыйна адзначаюць высокі ўзровень выдавецкай працы ў Беларусі. Дадам, што нашы пераможцы на конкурсе «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД прайшлі строгі адбор у плане вылучэння з Беларусі. Прыемна, што сёлета былі падведзены вынікі і ў спаборніцтве найлепшых кнігарань на прасторах Садружнасці Незалежных дзяржаў. Адзначаны і наш мінскі «Светач».



Фота БелТА.

### АГУЛЬНЫ МАСТАЦКІ, ЛІТАРАТУРНЫ ПОШУК

Падзеяй 37-га Маскоўскага міжнароднага кніжнага кірмашу стаў круглы стол беларускіх і расійскіх пісьменнікаў «Разам: традыцыі, вопыт, перспектывы беларуска-расійскага літаратурнага адзінства», які прайшоў у Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Размова адбылася даволі цікавая, насычаная разглядам розных актуальных і праблемных пытанняў увогуле ў гуманітарным развіцці грамадства. Пісьменнікі, кнігавыдаўцы дзяліліся сваёй ацэнкай зносін з чытачамі, асабліва — з моладдзю і школьнікамі. Расійскі дзіцячы пісьменнік, кандыдат псіхалагічных навук Лілія Кандыбовіч, якая часта бывае і ў Беларусі, звярнула ўвагу на патрэбу стварэння сучасных мастацкіх вобразаў герояў, з якіх юныя чытачы маглі б браць прыклад. Кнігавыдавец Сяргей Майсееў расказваў пра свой выдавецкі вопыт стварэння кніг, звязаных з агульнымі аспектамі гісторыі народаў Расіі і Беларусі. Сяргей Мікалаевіч адзначыў, што намаганні пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў без выразнай падтрымкі сістэмы адукацыі наўрад ці будуць эфектыўнымі. Часам і пры ўмове, што гатовы бясплатна перадаць кнігі школьнікам, выдаўцы не знаходзяць падтрымку ў інстытутаў адукацыі.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Расіі Мікалай Іваноў унёс прапановы болей шырокага супольніцтва ў справе падтрымкі творчай моладзі. І ў Мінску, і ў Маскве ў пісьменніцкіх арганізацыях працуюць саветы творчай моладзі. Важна, каб быў наладжаны абмен ініцыятывамі, рознымі праектамі. Дзеля гэтага неабходна звяртаць увагу і на развіццё мастацкага перакладу. Гэтыя ініцыятывы прыйшліся даспадобы і галоўнаму рэдактару часопіса «Роман-газета» вядомаму празаіку Юрыю Казлову. Ён не першы раз вылучае ідэі па прадстаўленні на старонках свайго выдання, а таксама «Детской роман-газеты» твораў беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку — і перакладаў на рускую мову аповесцяў і апавяданняў тых літаратараў, хто піша па-беларуску. У найбліжэйшы час «Роман-газета» надрукуе новы твор Вячаслава Бандарэнкі, які жыве і працуе ў Беларусі, але часта друкуецца ў Маскве. Цікавым было выступленне даследчыцы гісторыі літаратуры пушкіністкі Ларысы Чаркашынай, якая, дарэчы, нарадзілася ў Беларусі, у Ваўкавыску. Ларыса Андрэеўна гаварыла пра магчымасці выкарыстання класічнай літаратурнай класікі ў справе выхавання чытача.

Удзел у круглым стале «Разам...» узяў і дарадца Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі вядомы палітолаг і аўтар парламенцкай і ўрадавай газеты «Звязда» Аляксандр Шпакоўскі. Ён выказаў прапанову часцей творчым людзям прыходзіць на пляцоўку прэс-цэнтра беларускага пасольства, дзе створаны ўсе ўмовы для канструктыўнага дыялогу пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, перакладчыкаў. З беларускага боку ўдзел у дыскусіі бралі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Вольга Рацэвіч, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ларыса Кучарава, генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Уладзімір Матусевіч.

### ЗАДАННІ НА ЗАЎТРА

Сярод цікавых асоб, пісьменнікаў, грамадскіх, палітычных, культурных дзеячаў наведвалі навідавоку на міжнародным кніжным кірмашы былі перш-наперш расійскія пісьменнікі, аўтары папулярных кніг, кіраўнікі славутых выдавецтваў. Па традыцыі ганаровы госць Маскоўскага кірмашу — спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой. Дарэчы, ён прыйшоў да чытачоў, наведвальнікаў маскоўскага кніжнага свята з уласнай публіцыстычнай кнігай — «Культурная рэвалюцыя». У цэнтры ўвагі — і дырэктар Дэпартамента дзяржаўнай падтрымкі перыядычнага друку і кніжнай індустрыі Міністэрства лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі Уладзімір Грыгор'еў. З гэтымі кіраўнікамі на пляцоўцы кірмашу і сустрэліся генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Уладзімір Матусевіч і старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч. Размова ішла пра болей актыўнае супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх кніжнікаў, пра юбілеі пісьменнікаў, чыя творчасць аднолькава цікавая і ў Расіі, і ў Беларусі. У час перагавораў вылучана ідэя правесці новы кніжны фестываль з удзелам расійскіх выдавецтваў у Беларусі — напрыклад у адной са славутых гістарычных мясцін. Некалі фестываль такога характару ўжо праводзіўся — «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку» (2019—2020 гады). Заснавальнікам яго было Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Для беларускага чытача, пакупніка, безумоўна, пляцоўка такога характару, знаёмства з кніжнымі навінкамі Расіі — вартая ўвагі падзея.

Уладзімір Уладзіміравіч Матусевіч сустрэўся і з галоўным рэдактарам часопіса «Книжная индустрия», прэзідэнтам Асацыяцыі кнігараспаўсюджвальнікаў Расіі Святланай Зорынай. Ішла размова пра болей шырокую прапаганду беларускай кнігі ў Расійскай Федэрацыі. Прайшлі перагаворы і з кіраўніцтвам аўтарытэтнага расійскага праекта «Кніжны цягнік». Максім Афоненкаў і Дзяніс Котаў унеслі прапанову пракласці маршрут «Кніжнага цягніка» з удзелам вялікай дэлегацыі беларускіх пісьменнікаў і праз сталіцу Беларусі — Мінск.

...Расійская Федэрацыя мае свой каляндар кніжных кірмашоў, кніжных фестываляў і выставак. Праводзяцца яны не толькі ў Маскве і Санкт-Пецярбургу, але і ў іншых гарадах, іншых рэгіёнах. Мажліва, і беларуска-расійскае кніжнае супрацоўніцтва варта распаўсюдзіць на болей шырокую прастору, вылучыўшы новыя ініцыятывы па прапагандзе айчыннай кнігі, па пашырэнні магчымасцяў у беларусаў адкрываць новыя прасторы знаёмства з расійскай кнігай.

**Кастусь ХАДЫКА.**

*Масква.*

# АРТЭФАКТЫ, ДАКУМЕНТЫ, СУДОВЫЯ СПРАВЫ

## Што ажыўляе гісторыю Мінска

**УЖО стала добрай традыцыяй напярэдадні дня нараджэння сталіцы праводзіць міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі». Сёлета ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук яна сабрала вучоных, работнікаў музеяў, архіваў, выкладчыкаў, краязнаўцаў ужо сёмы раз. Канферэнцыя была прысвечана 525-годдзю надання Мінску Магдэбургскага права. У рамках чатырох секцый прагучала каля ста навуковых дакладаў, якія ахоплівалі розныя гістарычныя перыяды. Таксама працавала выстаўка, дзе былі прадстаўлены як кнігі даследчыкаў гісторыі горада, так і архіўныя крыніцы.**

### «Не трэба слёз, не трэба роспачы»

Падчас адкрыцця канферэнцыі акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя згадаў, што першы раз свята горада жыхары сталіцы адзначылі 28 мая 1967 года. І хаця ў савецкія часы не прынята было адзначаць святы гарадоў, тым не менш мінчане не забываліся пра дзень нараджэння сталіцы. А ў 2007 годзе па ініцыятыве Інстытута гісторыі і Мінгарвыканкама прайшла першая навуковая канферэнцыя, звязаная з даследаваннем гісторыі горада. Акадэмік упэўнены, што сабраныя даследчыкамі матэрыялы важна выкарыстоўваць у падрыхтоўцы падрастаючага пакалення. З Мінскам звязаны лёсы многіх выдатных асоб, акрамя таго, праз гісторыю сталіцы можна бачыць шлях народа:

— З моманту свайго заснавання Мінск з'яўляўся важным пасяленнем, якое мела стратэгічнае значэнне і ўжо ў XII ст. стала цэнтрам удзельнага княства. Менавіта ў Мінску была абвешчана і пачыналася беларуская нацыянальная дзяржава. У 1919 годзе Мінск стаў сталіцай савецкай сацыялістычнай рэспублікі. У савецкай гісторыі ён пачаў імклівае індустрыяльнае развіццё, з гонарам вынес цяжкія выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны, аб чым сведчыць высокае званне горада-героя, якое было прысвоена ў 1974 годзе.

Аляксандр Каваленя згадаў, што ў гады вайны ў мінскім падполлі змагалася больш за 9 тысяч патрыётаў, і зачытаў радкі з ліста, дасланага з засценкаў гестапа Іванам Казловым: «Слёз не трэба, к чорту слёзы. Гінуць мільёны, а чым мы лепшыя за іх? Сапраўдны патрыёт той, хто смела глядзіць у вочы смерці. Не трэба слёз, не трэба роспачы. Наша кроў не пральецца дарма. Трымайцеся, не бойцеся і не адчайвайцеся. Эх, жыць вельмі хочацца. Помсціць гэтым варварам — вось што трэба рабіць».

Менавіта перыяду Вялікай Айчыннай вайны на канферэнцыі было прысвечана некалькі дакладаў. Так, загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Аляксей Літвін расказаў пра падпольную арганізацыю на тэрыторыі Грушаўскага пасёлка, якая дзейнічала ў Мінску з 1941 да 1943 года. Да гэтага часу пра яе вельмі мала напісана, але вучоны ўпэўнены, што абавязкова трэба збіраць інфармацыю пра патрыётаў. Яшчэ ў 1980-я гады ён быў членам камісіі, якая займалася вывучэннем мінскага падполля. Для таго, каб інфармацыя пра падпольшчыкаў была прызнана Мінскім гаркамам партыі, трэба было давесці на дакументальнай базе, на аснове паказанняў сведак, савецкіх і нямецкіх крыніцах, што арганізацыя існавала. Так, падчас работы з дакументамі ён выйшаў на арганізацыю, якая працавала ў адным з рабочых пасёлкаў — Грушаўскім. Асноўная маса яе удзельнікаў — камуністы, камсамольцы і члены іх сем'яў. У склад арганізацыі ўваходзіла



некалькі падпольных груп. Кіраваў ёй Сямён Гапоненка. Як заўважыў гісторык, асаблівасць гэтай арганізацыі, як і іншых, што ствараліся ў Мінску ў 1941 годзе, у першую чаргу ў тым, што спачатку камуністы ўстанаўлівалі сувязі з кіруючымі кадрамі, якіх ведалі да вайны.

Паступова ствараўся ланцужок падпольных арганізацый, якія існавалі ў розных частках Мінска. Трагедыя мінскага падполля ў тым, што яно было некалькі разоў раскрыта нямецка-фашысцкімі карнымі органамі. Было некалькі буйных правалаў, адзін з іх — у сакавіку—красавіку, другі — у верасні—кастрычніку 1942 года.

Па вуліцы Пагранічная, 5 пражываў Сямён Гапоненка, побач жыў яшчэ адзін камуніст. Вакол іх пачалі аб'ядноўвацца камуністы, пераважна тыя, што прыехалі з Беластока і заходніх абласцей Беларусі. Сярод іх былі і камандзіры, палітработнікі Чырвонай Арміі, якія не трапілі ў палон, але, калі апынуліся ў акружэнні, ішлі ў вялікі горад, дзе прасцей было схавацца. З 1942 года, пасля першага правалу, арганізацыяй кіраваў Назарый Герасіменка, сакратар Сталінскага падпольнага райкама партыі, які быў добра знаёмы з Сямёнам Гапоненкам.

Падпольная група была галоўнай у арганізацыі партызанскага атрада Нікіціна. Атрад хутка папаўняўся людзьмі, перадавалася зброя. Нікіцін прыняў рашэнне рухацца за лінію фронту. Да гэтага яго атрад правёў шэраг дыверсій, удзельнічаў у разгроме паліцэйскага батальёна. Да лістапада 1942 года, калі атраду ўдалося выйсці за лінію фронту ў Мінску, ужо адбыліся арышты і былі пушчаны чуткі, што падполле правакацыйнае. Нікіцін і ўсе яго людзі трапілі пад падазрэнне. Нікіцін быў арыштаваны. Але захаваліся дакументы, якія ён рыхтаваў, каб прадставіць сваіх людзей да ўзнагарод, а ў іх — шмат інфармацыі пра дзейнасць падпольнай групы. Быў арыштаваны і Гапоненка, загінуў у турме Герасіменка. І гэта адна з прычын, чаму пра падпольную групу не прынята было згадваць.

Навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Валерый Надтачаеў расказаў пра падпольную групу «Артур», інфармацыі пра якую багата ў Нацыянальным архіве. «Артур» — псеўданім яе кіраўніка Мікалая Філановіча і пазыўны радыёстанцыі.

— На прыкладзе групы можна добра ілюстраваць работу падполля. Дастаткова матэрыялаў захавалася, якія дазваляюць скласці ўяўлененне аб структуры, задачах і нават размеркаванні роляў падпольшчыкаў. У шэрагу выпадкаў магчыма прасачыць іх лёсы. Вядомы і праціўнік — смаленскае СД, якое абсталявалася на Астроўскага, 7, а ў сутарэннях там была арганізавана турма, дзе праз катаванні прайшлі многія падпольшчыкі, якія пасля загінулі ў Трасцянцы, — заўважыў даследчык і звярнуў увагу на тое, што падпольная група «Артур» можа лічыцца «доўгажыхаром»: яна дзейнічала да 1944 года. Дакументы сведчаць, як вялася работа: горад быў падзелены на ўмоўныя зоны, а таксама на так званыя прыгарадныя. У кожнай дзейнічала свая група. Архіўная справа на групу «Артур» — адна з нямногіх, дзе ўказана, якія задачы выконвалі падпольшчыкі, якія мелі «пасады»: агент-асведамляльнік, кіраўнік групы чыгуначнага ўліку, камандзір групы дыверсій на чыгунцы, камандзір аператыўнай групы мясцовай разведкі.




Гісторыя «Артура» звязана з аператыўнай групай Леаніда Сарокі, які ў верасні 1942 года быў закінуты на акупаваную тэрыторыю для вядзення барацьбы. У кастрычніку 1942 года пра яго маецца інфармацыя як пра камандзіра партызанскага атрада імя Варашылава. А ў лістападзе ён стварае разведвузвод Філановіча.

Сарока загінуў у чэрвені 1944 года, падрыхтаваныя ім узнагародныя лісты так і не былі выкарыстаны.

### Раскапаная гісторыя

Адна з ключавых тэм канферэнцыі датычылася гісторыі ўзнікнення горада. Ужо не першы год вядуцца раскопкі гарадзішча на Менцы. Кіраўнік іх — археолаг Андрэй Вайцяховіч — прадставіў апошнія вынікі даследаванняў. У мінулым годзе, згодна з даручэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, на археалагічным комплексе пачаліся маштабныя даследаванні, мэтай якіх было пацвердзіць ці, наадварот, абвергнуць версію, што пасяленне побач з ракой Менкай з'яўлялася старажытнарускім горадам, які і мог быць летапісным Мінскам. Летась даследаванні далі багаты матэрыял, які сёлета быў дапоўнены новымі артэфактамі.

— У мінулым годзе галоўнай падзеяй стала даследаванне вала вялікага гарадзішча. У канцы восені мы знайшлі і раскрылі сляды драўляных канструкцый, — падзяліўся археолаг.

У гэтым годзе было зроблена некалькі раскопаў: на месцы прарэзкі вала, на малым гарадзішчы, і тры раскопы на пасадзе і на пляцоўцы вялікага гарадзішча. У выніку даследавання вала былі расчышчаны рэшткі клецяў, якія ўяўлялі сабой аснову драўляна-земляных умацаванняў. Сярэдні памер клеці — 14 на 8 метраў. Яны былі складзены з дубовых бярвёнаў. Вышыня сцяны дасягала 6-7 метраў. Находка ўнікальная: ва Усходняй Еўропе няма пабудоў такой захаванасці. Радыевугляродны аналіз дрэва, праведзены летась, паказаў, што час пабудовы клецяў, верагодней за ўсё, адносіцца да 990-х гадоў. У запаўненні клецяў былі знойдзены шматлікія фрагменты керамікі, падвескі, пярсцёнак, наканечнік стралы, каля 12 драўляных рыдлёвак. Усе гэтыя матэрыялы датуюцца X — пачаткам XI стст., што пацвярджае радыевугляродны аналіз. У адным з дрэў знайшлі ўстаўленую сківіцу дзіка. Прыклады такіх свяшчэнных дубоў вядомы, яны адносяцца да паганскага часу. Акрамя таго, з боку ракі Менкі знойдзены яшчэ два дадатковыя рады ўмацаванняў, якія былі выкананы ў іншай тэхніцы — дубовыя бярвёны, укладзеныя ў чатыры вянцы. Іх утрымлівалі бярвёны з крукамі.

Зыходзячы з унікальнасці канструкцый, прынята рашэнне іх закансерваваць. Дзве клеці і частка новых выяўленых абарончых збудаванняў былі выняты і вывезены ў Гомель, дзе спецыялісты маюць вялікі вопыт у рэстаўрацыі і кансервацыі моранага дубу.

На пляцоўцы вялікага гарадзішча, нягледзячы на тое, што культурны пласт быў моцна пашкоджаны гаспадарамі сядзібы, якая тут існавала ў XVI—XIX ст., атрыманы дадаткова цікавыя матэрыялы старажытнарускага часу, зафіксаваны ў паўднёва-заходняй частцы раскопу сляды магутнага пажару, які адбыўся ў XI стагоддзі. Сярод знойдзеных матэрыялаў — крыжык, некалькі свінцовых пломб, элементы вупражы каня, элементы адзення XI—XII ст., ключы і іншыя матэрыялы гэтага часу і, канешне, вялікая колькасць фрагментаў керамікі. Але самая цікавая знаходка — пахаванні. Гэта знаходка дае падставу меркаваць, што недзе побач была царква. Падобныя пахаванні за сценамі маглі здзяйсняцца толькі ў адным выпадку: калі яны былі звязаны з царквой, чаму ёсць шмат прыкладаў у старажытнарускіх гарадах. У наступным годзе плануецца працягнуць даследаванні і зрабіць спробу адшукаць месца былой царквы. На тое, што яна існавала, указваюць нацельныя крыжыкі, кадзіла і гузік, які, хутчэй за ўсё, быў на адзенні манаха. Калі рэшткі храма атрымаецца адшукаць, магчыма, гэта будзе самая старажытная царква на тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі.

Цікавымі матэрыяламі багаты і раскоп на малым гарадзішчы. На пляцоўцы гарадзішча каля вала знойдзены сляды згарэлай клеці. Сляды магутнага пажару зафіксаваны амаль па ўсёй пляцоўцы гарадзішча. У пажары знойдзены шматлікія фрагменты наканечнікаў стрэл, баявая сякера, заклёпкі, магчыма, ад драўляных шчытоў. Гэта паказвае на тое, што на малым гарадзішчы знаходзіліся прадстаўнікі дружыны, быў ваенны канфлікт, і малое гарадзішча спалілі. Раскопкі паказалі, што суседняя частка паўднёва-заходняга вялікага гарадзішча таксама падвяргалася магутнаму пажару.

— Матэрыялы яшчэ будуць апрацоўвацца, але ўжо з упэўненасцю можна сказаць, што пасяленне на Менцы было старажытным горадам, які меў буйныя драўляныя ўмацаванні — вышынёй каля 8 метраў. Прычым знойдзеныя ў археалагічным комплексе на Менцы клеці з'яўляюцца драўляна-землянымі ўмацаваннямі, характэрнымі для старажытнарускага горада X—XI стст., а ўмацаванні Мінска на Свіслачы ўласцівыя для XII ст., — заўважыў археолаг.

### Новыя тэмы

Падчас канферэнцыі закраналіся і малавядомыя старонкі горада, пры гэтым даследчыкі распрацоўвалі новыя пытанні. Расказвалі, напрыклад, пра канфесійнае жыццё Мінска XVII ст., першую ўсебеларускую краязнаўчую канферэнцыю, дзейнасць мінскага сіроцкага суда ў XIX стагоддзі. А старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Алена Сакольчык распавяла пра мінскіх падкідышаў. У другой палове XIX стагоддзя радкі пра іх можна было знайсці ў перыёдыцы. Пра актуальнасць праблемы сведчыць і народная творчасць — песні, казкі, а часам і прозвішчы: так, саборным маглі назваць немаўля, знойдзенае пры храме. Малых пакідалі пры шпіталях, дабрачынных арганізацыях, побач з дамамі багатых, бяздзетных сем'яў. Дарэчы, пакіданне дзяцей у людным месцы не каралася настолькі жорстка, як там, дзе малога маглі б і не знайсці. У першым выпадку вінаватым прызначалі тры месяцы пазбаўлення волі. Адшукаць вінаватых было няпроста. Паліцэйскія, якія гэтым займаліся, апытвалі магчымых сведкаў, уважліва прыглядаліся да рэчаў, якія былі з малым. Укладаліся ў скруткі з немаўляткамі часам і багатыя рэчы, і запіскі, дзе пазначаліся звесткі пра веравызнанне малога і ці ахрышчаны ён. Праўда, як заўважыла даследчыца, у тых справах, што яна разглядала, запіскі ніколі не дапамагалі ў пошуку, часцей спрацоўвалі чуткі, у якіх часам гараджане абмяркоўвалі пазашлюбныя сувязі.

**Запісала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, фота аўтара.**

# АРЫЕНЦІРЫ ВЯЛІКАГА

**Адкрыццё новага тэатральнага сезона для многіх калектываў звязана з абнаўленнем і ўвядзеннем іншых падыходаў да працы. Пра што і заяўляе Вялікі тэатр Беларусі, нават на ўзроўні продажу квіткоў. Ужо цяпер іх можна набыць на спектаклі, якія запланаваны ў снежні.**

## НОВЫЯ ЎМОВЫ

— Упершыню ў нас атрымалася сваю афішу скласці далёка наперад. Гэта вялікая справа — доўгатэрміновае планаванне, але так і павінна быць. Радуе, што палова квіткоў на снежань ужо прададзена. Нам гэта цяпер жыццёва неабходна, таму што новыя ўмовы фінансавання патрабуюць таго, каб мы бачылі, што нас чакае наперадзе, — адзначыла генеральны **дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі Кацярына ДУЛАВА** на сустрэчы перад афіцыйным адкрыццём сезона. — Калі мы ўступаем у перыяд новых фінансавых умоў, то перад намі стаіць задача — падумаць пра тое, як у тэатр могуць паступаць грошы, як яны павінны расходавацца. Задача даволі дзёрзкая, пры тым што ўмовы працы практычна не змяніліся. Тым больш што для тэатра даход (найбольш вялікая яго частка) — гэта продаж квіткоў і гастролі (а цяпер гэта даволі складана). Але мы знаходзім выйсце, і магу канстатаваць, што вытрымліваем патрабаванні, якія прапанавала дзяржава, каб напрыканцы года атрымаць фінансавыя паказчыкі, якіх ад нас чакаюць.

Абнаўленне датычыцца і самога калектыву: у новым сезоне ў тэатр прыходзяць 18 маладых спецыялістаў, у прыватнасці 11 з іх — у трупу балета, у трупу оперы адзін саліст, чацвёра музыкантаў — у аркестр. Дзеля больш паспяховай адаптацыі навічкоў у калектыве ўведзена практыка настаўніцтва: за кожным пачаткоўцам замацоўваецца мэтр, які будзе яго творчым куратарам.

## ПРЭМ'ЕРЫ СЕЗОНА

— Сур'ёзна рыхтуемся да прэм'еры рэдкага і новага для нас праекта, у якім задзейнічаны ўсе трупы, — «Патэтычны дзённік памяці». Гэта вялікае палатно, прысвечана падзеям вайны і міру, трагічным і радасным момантам гісторыі нашай краіны. Найбольш важна для нас, што выкарыстана класічная музыка беларускіх кампазітараў, якая прайшла выпрабаванне часам. Гэта найлепшыя майстры, якія ў 50—60—70-я гады мінулага стагоддзя пісалі пра вайну з высокай ступенню актуальнасці, пачуццём трагізму. Спадзяёмся, што прэм'ера, якая павінна адбыцца ўжо напрыканцы верасня, надасць новае гучанне гэтай тэме. Знакавы факт, што нас падтрымаў кіраўнік дзяржавы, і пастаноўка атрымала неабходнае фінансаванне, — паведаміла Кацярына Дулава. — Згодна з умовамі гранта, мы павінны паказаць гэты праект у іншых гарадах Беларусі. Калі ўбачылі, што ў нас атрымалася (а гэта манументальнае палатно, шмат масавых сцэн з удзелам балета, хору), і пачалі вывучаць сцэнічныя пляцоўкі, то зразумелі: складана з тымі, якія падтрымліваюць нашы патрабаванні. Але ўсё наша творчае кіраўніцтва з'ездзіла ў Брэсцкую крэпасць, і мы прыйшлі да высновы, што там сама атмасфера адпавядае дзеі. Таму 5 кастрычніка гэты спектакль прадставім без дэкарацый — іх ролю выканае сама крэпасць і яе манументальныя кампазіцыі.

Таксама на новы сезон кіраўніцтва Вялікага анансуе прэм'еру абноўленага дзіцячага спектакля «Тры парсючкі» для самых маленькіх. Цяпер цалкам пераглядаюцца касцюмы, сцэнаграфічнае вырашэнне. Спектакль павінен стаць больш яркім, дынамічным.

Прэм'ера для дарослых — спектакль, які ёсць у оперным тэатры любой краіны, — «Яўгеній Анегін» Пятра Чайкоўскага. Мы яго ўбачым у новым варыянце, што прапануе Ганна Маторная. Мастак па касцюмах — Таццяна Лісавенка. Дырыжор і музычны кіраўнік пастаноўкі — Арцём Макараў. Яго прэм'еру прымяркуюць да адкрыцця опернага форуму ў снежні.

Дарэчы, у межах опернага форуму для нас рыхтуюць нямала адметных падзей. Адна з іх — канцэрт лаўрэатаў конкурсу Алены Абразцовай. Але варта звярнуць увагу на ўдзел у форуме Чувашскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Дзякуючы тэатру «Волга Опера» з горада Чабаксары мы ўпершыню ўбачым узор электроннай оперы, што прагрымела на ўсю Расію. І яшчэ амбітная ідэя — каб нейкі твор выканалі ўсе запрошаныя выканаўцы.

У другой палове сезона (напрыканцы сакавіка) Ігар Колб павінен запрасіць на вечар трох аднаактовых балетаў. А ў канцы мая — чэрвені чакаем оперу, якой не было на сцэне Вялікага тэатра Беларусі ніколі, — «Арлеанская дзева» Пятра Чайкоўскага. Пастаноўшчыкам выступіць Георгій Ісаакян, галоўны рэжысёр і мастацкі кіраўнік Маскоўскага дзяржаўнага акадэмічнага Дзіцячага музычнага тэатра імя Наталлі Сац. Музычным кіраўніком пастаноўкі будзе Арцём Макараў.

## КАНЦЭРТЫ, ГАСТРОЛІ

Згадваючы самае адметнае выступленне, якое артысты тэатра мелі за апошні час, генеральны дырэктар без ваганняў назвала летнюю паездку ў Нікарагуа — хоць і далёка, але яно таго варта, таму што гала-канцэрт у оперным тэатры Манагуа адзначыў дзве даты: 80-годдзе вызвалення Беларусі і 45-я ўгодкі перамогі Сандзіністкай рэвалюцыі:

— З нашага жыцця не сыходзяць мерапрыемствы, звязаныя з жыццём краіны. У прыватнасці, 8 снежня плануецца правядзенне канцэрта да 25-годдзя падпісання дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Пакуль гаворка ідзе аб прыездзе салістаў і аркестра Марыінскага тэатра на чале з Валерыем Гергіевым.

Акрамя таго, публіку чакае шэраг адметных канцэртаў, калі сябе як асобную творчую адзінку прадставіць сімфанічны аркестр тэатра. Юбілей кампазітара Яўгена Глебава сёлета будзе адзначаны паказам спектакля «Маленькі прынц» — калі трупа балета вернецца з Самары, дзе бярэ ўдзел у новым фестывалі «Шастаковіч. Па-над часам». Балет «Ілюзіі кахання» (гучыць музыка кампазітара) адкрые фестываль. Але паколькі праграма дазваляе згадаць сучаснікаў і сяброў Шастаковіча, то запрошаны яшчэ адзін наш балет — «Спартак» Арама Хачатурана ў пастаноўцы Валянціна Елізар'ева.




У другой дэкадзе снежня амаль месяц у гастрольным туры па гарадах Кітая будуць аркестр і артысты беларускай оперы. Але і нас не абыходзяць увагай. У кастрычніку з гастролямі прыязджае тэатр імя Наталлі Сац, які не быў у Мінску ніколі: калі хто думае, як выхоўваць дзяцей на ўзорах высокай культуры і рабіць іх цікавымі для гэтай асаблівай аўдыторыі, то варта паклапаціцца пра квіткі. Прывязуць дзве оперы: «Уладар мух» Яфрэма Падгайца і «Кармен» Жоржа Бізэ — уяўляеце іспанскія жарсці ў пастаноўцы для дзяцей?.. Паглядзім.

Але спачатку на адкрыццё сезона, 8 верасня, Вялікі тэатр абраў «Царскую нявесту» Рымскага-Корсакава. Таксама жарсці, і ўсё па-даросламу...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Суайчыннікі

# ЗАХОЎВАЦЬ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ ДАЛЁКА АД РАДЗІМЫ

## Пабачыла свет кніга «Малдаване Беларусі»

У Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь была прэзентавана кніга Лізаветы Квілінковай «Малдаване Беларусі: этнакультурная ідэнтычнасць і інтэграцыя». І хоць, як прызнаўся намеснік генеральнага дырэктара «нацыяналкі» Віктар Пшыбытка, тут ужо маецца каля пяці выданняў па культуры і традыцыях малдаван і 13 кніг гэтага ж аўтара, новае выданне — унікальнае навуковае даследаванне, прысвечанае малдаўскай дыяспары. Падобных прац няма ні ў адной з рэспублік постсавецкай прасторы. Больш за тое, не хапае і настолькі грунтоўных даследаванняў па іншых дыяспарах. А ў Беларусі пражываюць прадстаўнікі больш чым 150 нацыянальнасцяў. І, як падказаў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак, ён гатовы садзейнічаць у падрыхтоўцы падобных даследаванняў у дачыненні іншых нацыянальнасцяў. Упаўнаважаны заўважыў, што малдаване займаюць 11-е месца ў этнічнай структуры Беларусі. Яны з'яўляюцца спецыялістамі ў розных галінах, вельмі актыўныя ў грамадскім жыцці. Прадстаўнікі нацыянальна-культурнага аб'яднання далучаюцца да дабрачынных праектаў, бяруць удзел у канцэртах, фестывалях, святах, якія праводзяцца ў нашай краіне. У сваю чаргу дзяржава аказвае падтрымку, у тым ліку фінасавую, творчым калектывам, — напрыклад, ім шыюцца нацыянальныя строі. Усебакова раскрывацца прадстаўнікам дыяспары дапамагае тое, якая палітыка пабудавана ў дзяржаве. Як заўважыў Аляксандр Румак, тут сустракаюць не па нацыянальнасці, а па дабрыні душы.




Фота Лізаветы ГОПАД.



Акцэнт на гэта зрабіла і аўтар кнігі. Дарэчы, з сотні рэспандэнтаў, якіх яна апытвала падчас работы над кнігай, ні ад кога не пачула крытычнага водгуку, усе адчуваюць тут сябе як дома. Іх шляхі да Беларусі былі рознымі. Нехта пасяліўся пасля Вялікай Айчыннай вайны, хтосьці атрымліваў адукацыю ў беларускіх ВНУ, прыехаў сюды працаваць па размеркаванні альбо апынуўся па сямейных абставінах.

Доктар гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі Лізавета Квілінкова таксама прыехала сюды з Малдовы. Ідэю ўзяцца за даследаванне этнасаў спачатку гагаузаў, а пасля малдаван ёй падкінуў муж, які ў Малдове працаваў паслом Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, даследчыца раней пісала і пра беларусаў Малдовы. Яна расказала, што працаваць над новай кнігай пачала ў 2020 годзе. «Я заўважыла, што праз этнічныя супольнасці яскрава прасочваецца палітыка беларускай дзяржавы ў адносінах да нацыянальных меншасцяў. Тут не ўзнікае ніякіх нацыянальных пытанняў, людзі могуць рэалізоўвацца ў адпаведнасці са сваімі дыпломамі. Гэта гаворыць пра многае».

У першую чаргу яна хацела паказаць традыцыі, культуру малдаван, якія жывуць ва ўмовах дыяспары. Усё ж адна справа — займацца гэтым на радзіме, іншая — удалечыні. Яна таксама хацела перадаць асаблівасці нацыянальнага характару, кухні, працэс адаптацыі і інтэграцыі, тое, як малдаване ўспрымаюць беларусаў і наадварот, як выбудоўваюць сваяцкія адносіны.

І, канешне, даследчыца старалася паказаць унёсак малдаван Беларусі ў сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё краіны. Кніга багата ілюстраваная. Як упэўнена аўтар, тут паказана не толькі гісторыя малдаўскай дыяспары, але і наогул жыццё краіны, жыхарамі якой яны сталі.

Аўтар падзякавала старшыні таварыства сяброўства Беларусь — Малдова, Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Малдова з 2017 да 2022 года Віктару Сарачану за дапамогу ў рабоце над кнігай. У сваю чаргу ён адзначыў не толькі тытанічную працу даследчыцы па зборы інфармацыі, але і тое, што яна змясціла ў пачатку кнігі кароткую гісторыю Малдовы, што ў наш час, калі многія псеўдагісторыкі спрабуюць даказаць, што раней такой краіны не было, надзвычай важна. Мова, культура, традыцыі — у тым ліку ў захаванні дыяспары — ці не лепшая абарона гісторыі, народа.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества

## ОАО «Могилевхимволокно»

(г. Могилев, пр-т Шмидта-35)

**Аукцион состоится 25.09.2024 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**
(офис Организатора аукциона)

Лот № 1 **– капитальное строение с инв. 700/С-49754 – здание пилорамы РСЦ СГА**, пл. – 172,9 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения. **Асфальтобетонная площадка в районе здания пилорамы (**инв. № по бух. учету 2020008910).

**Ограждение из бетонных блоков,** инв. № по бух. учету 2010005700. **Ленточнопильный станок MG-6500 МЗФ,** инв. № по бух. учету 4450010300. **Лесорамма Р63-4А,** инв. № по бух. учету 4450005000. **Циклон с бункером приемником,** инв. № по бух. учету 4160046000. **Пила рамная 1250,** инв. № по бух. учету 9025020615. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Шмидта, 45, на земельном участке с кадастровым № 740100000005001828 (пл. 221,2366 га, право постоянного пользования, отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен). Обременения: 1) ипотека; 2) наличие незарегистрированной пристройки.

**Начальная цена продажи: 108 500,76 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 10 850,08 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка: BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901.

Срок внесения задатков и подачи документов для участия в аукционе: по 24.09.2024 до 11.00. Победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым счетом-фактурой. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона **Gostorg.by.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за три календарных дня до даты аукциона.

**Доп. информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» проводит **30 сентября 2024 года в 11.30** повторный открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена.

К отчуждению предлагается:

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4236, площадью 657,3 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административно бытовой корпус, составные части и принадлежности – отапливаемая пристройка, благоустройство территории, асфальтобетонное покрытие ограждение металлическое, ограждение железобетонное, расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 741000000007002893, 741000000007002894, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278.

Суммарная начальная стоимость имущества **97 500,00 белорусских рублей без учета НДС.**

**3.** Информация о земельном участке.

Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках с кадастровыми номерами:

741000000007002893, площадью 0,2401 га, находящемся в срочном возмездном владении и пользовании (договор аренды земельного участка № 108 от 12.09.2019);

741000000007002894, площадью 0,0465 га, находящемся в срочном возмездном владении и пользовании (договор аренды земельного участка № 107 от 12.09.2019).

4. Дата, время и место проведения аукциона: **30.09.2024 в 11.30** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; **дата: 24.09.2024; время: 17.00.**

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. На участие в аукционе к заявлению прилагается:

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;
- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

